ЗВЯЗДА

22 лютага 1996 г. чацвер, № 51 (22854)

• выдаецца са жніўня 1917 г. • БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА • цана 1000 рублёў

РОЗГАЛАС

УЗВЯДЗЕННЕ МАСТОЎ ПАМІЖ УСХОДАМ І ЗАХАДАМ — АДНА З АСНОЎНЫХ ЗАДАЧ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

— Мая краіна поўная рашучасці ўнесці свой уклад у пабудову новых мастоў паміж Усходам і Захадам у вельмі зменлівай Еўропе. Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Нідэрландаў Жорж Альбер Мары Вееры ў час цырымоніі ўручэння ім даверчых грамат Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку, якая адбылася 21 лютага ў рэзідэнцыі кіраўніка нашай дзяржавы.

Паводле слоў дыпламата, на жаль, гістарычна склалася так, што нашы народы не мелі магчымасці ажыццяўляць паўнацэнны абмен як таварамі, так і ідэямі. І цяпер найбольш важным і перспектыўным можа стаць супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Нідэрландамі ў галіне сельскай гаспадаркі, якая з'яўляецца адной з вядучых у эканоміцы абедзвюх дзяржаў. Многага, на яго думку, можна дасягнуць і ў навуковым абмене паміж краінамі. Адным з неабходных для развіцця ўзаемаадносінаў фактараў дыпламат лічыць таксама развіццё прыватнай ініцыятывы. У сувязі з гэтым пан Вееры запэўніў Аляксандра Лукашэнку, што і ўрад Нідэрландаў, і суб'екты эканомікі краіны маюць намер заахвочваць інвестыцыі ў беларускую эканоміку. Праўда, на думку пасла, для гэтага неабходна [illegible] да мінімуму.

Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні адзначыў добрую інфармаванасць кіраўніка дыпламатычнай місіі Нідэрландаў аб структуры беларускай эканомікі, што, на думку Прэзідэнта, павінна садзейнічаць росту ўзаемаразумення, умацаванню і далейшаму развіццю беларуска-галандскіх адносінаў у эканамічнай галіне. Прэзідэнт лічыць, што пры жаданні супрацоўніцтва дзвюх краін можа выйсці за рамкі тавараабмену сельскагаспадарчай прадукцыяй, паколькі абедзве дзяржавы маюць шырокі спектр тавараў, у пастаўках якіх ёсць узаемная зацікаўленасць.

Другім дыпламатам, які ўручыў у гэты дзень даверчыя граматы Прэзідэнту Беларусі, стаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Партугальскай Рэспублікі Жазэ Мануэл Вілаш-Боаш, які заявіў, што прэзідэнтам Партугаліі на яго была ўскладзена асобая місія — зрабіць усё, што ад яго залежыць, для ўстанаўлення і далейшага развіцця нармальных беларуска-партугальскіх адносінаў.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь, як і Партугалія, зацікаўлена ў паглыбленні двухбаковых кантактаў на розных узроўнях. Пры асабістай сустрэчы з кіраўніком гэтай краіны, паводле яго слоў, было дасягнута поўнае ўзаемаразуменне ў неабходнасці рэалізацыі ўсяго намечанага ў гэтай галіне. А расставіць усе кропкі [illegible]

Ігар РУБАН, БЕЛТА.

САКРЭТНЫ АБ'ЕКТ МЯНЯЕ ЎЛАСНІКА

Вызначаны лёс яшчэ аднаго былога сакрэтнага аб'екта з ліку тых, што засталіся ў спадчыну нашай рэспубліцы пасля распаду Савецкага Саюза.

Два месяцы таму было аб'яўлена аб продажы шэрага будынкаў недабудаванага ў Свіслацкім раёне ваеннага гарадка, які прызначаўся для каманднага пункта Аб'яднаных узброеных сіл краін — удзельніц Варшаўскага Дагавора. Аднак пакупнікі так і не знайшліся, а безгаспадарная маёмасць імкліва страчвала свой «таварны выгляд». Таму Гродзенскі аблвыканком прыняў рашэнне аб бязвыплатнай перадачы часткі збудаванняў у камунальную ўласнасць мясцоваму райвыканкому. У іх ліку два інтэрнаты, казарма, клуб, кацельня, некалькі падсобных памяшканняў, камунікацыі, а таксама нявыкарыстаныя будаўнічыя канструкцыі і матэрыялы.

У сваю чаргу Свіслацкі райвыканком вырашыў размеркаваць перададзеную яму маёмасць паміж мясцовымі дзяржаўнымі прадпрыемствамі і арганізацыямі. Таксама бязвыплатна. У хуткім часе павінен вызначыцца лёс іншых збудаванняў былога сакрэтнага аб'екта, уключаючы шматпавярховы, размешчаны пад зямлёй жалезабетонны будынак самога каманднага пункта.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ, БЕЛТА.

КАНФЕРЭНЦ-ЗАЛА

КАМІТЭТ ПА ДРУКУ МАЕ НАМЕР УЗНЯЦЬ ПРЭСТЫЖ ПРЭСЫ

У грамадскім прэс-цэнтры Дома друку адбылася сустрэча старшыні нядаўна створанага Дзяржаўнага камітэта РБ па друку Уладзіміра Бельскага з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі.

У сваім выступленні У. Бельскі падкрэсліў, што сёння ў нашай краіне «чацвёртая ўлада» знаходзіцца «на задворках». У ліку адной з галоўных задач, якія стаяць перад новым камітэтам, з'яўляецца ўзняцце яе прэстыжу ў вачах грамадства, а таксама стварэнне магутнай юрыдычнай службы. Дзяржаўны камітэт па друку закліканы выконваць ролю «трацейскага суддзі» паміж журналістам, Законам аб друку і чытачом. [illegible] У. Бельскі паабяцаў [illegible]

Дзяржаўны камітэт па друку лічыць мэтазгоднай цэнтралізацыю паліграфічнай базы і [illegible] акцыяніраванне, прычым кантрольны пакет акцый, як мяркуецца, павінен застацца ў руках дзяржавы. У планах Камітэта таксама будаўніцтва цэлюлозна-папяровага камбіната. Камітэт мае намер аказваць сур'ёзную падтрымку раённым перыядычным выданням. Ужо сёння ідзе распрацоўка канцэпцыі новай газеты «Белорусская пресса», на старонках якой атрымае магчымасць самавыяўлення ўвесь журналісцкі корпус.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

ДЭПУТАТЫ ЗАСТАЮЦЦА БЕЗМАНДАТНІКАМІ, АЛЕ ПРАЦЯГВАЮЦЬ УДАСКАНАЛЬВАЦЬ ПАДАТКІ

Дзве асноўныя тэмы ўчарашняга пленарнага пасяджэння сесіі Вярхоўнага Савета — унясенне змяненняў у падатковае заканадаўства і зацвярджэнне парадку дня першай сесіі Вярхоўнага Савета.

Так, перш чым працягнуць работу над падаткамі, дэпутацкі корпус вырашыў урэшце закончыць фарміраванне плана бягучай сесіі. Як вядома, некалькі тыдняў таму ў парадак дня было ўжо ўключана 18 пунктаў.

Учора ж парламент дабавіў яшчэ некалькі. Сярод іх — прапанова Кабінета Міністраў і фракцыі аграрнікаў «Аб стане спраў у аграпрамысловым комплексе і шляхах выхаду з крызісу», а таксама «Аб мерах па паляпшэнню ўзаемаразліковых адносін у АПК» — ўзаемапляцяжоў у АПК». Цэлы шэраг падпунктаў утрымлівае пытанне, якое прадугледжвае разгляд законапраектаў па меры іх падрыхтоўкі. Аднак акрамя падрыхтаваных камісіямі Вярхоўнага Савета прапаноў яшчэ некалькі было ўнесена непасрэдна ў час разгляду парадку.

Адзначу найбольш важныя. Напрыклад, большасць дэпутатаў пагадзілася з ініцыятывай фракцыі «Грамадзянскае дзеянне» аб стварэнні Часовай камісіі па праверцы законнасці акцыяніравання Ашчаднага банка і яго зліцця з «Беларусбанкам». Адобрана таксама прапанова ўнесці на бягучай сесіі папраўкі ў Закон «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». Мяркуецца, што дэпутаты разгледзяць законапраекты аб КДБ, аб ахове працы, аб праве грамадзян на свабодны выбар месца жыхарства і перамяшчэнне па тэрыторыі Беларусі. Дарэчы, апошні законапраект трапляе ў шэраг тых, якія трэба разгледзець да 15 сакавіка бягучага года, паколькі ён вынікае з Канстытуцыі. Як сказана ў артыкуле 6 Закона «Аб парадку ўступлення ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь», «на працягу двух гадоў пасля ўступлення ў сілу Канстытуцыі павінны быць прыняты законы, якія рэгулююць пераход да рэалізацыі правоў, прадугледжаных у артыкулах 30 (у частцы свабоднага перамяшчэння і выбару месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь) і 46 Канстытуцыі». На практыцы прыняцце гэтага закона будзе азначаць адмену ў Беларусі інстытута прапіскі і г. д. У цэлым парадак дня першай сесіі быў адобраны 159 галасамі.

Далей заканадаўцы перайшлі да падаткаў. Як вядома, зараз ідзе ўнясенне паправак і дапаўненняў у Закон «Аб акцызах».

Неабходна адзначыць некалькі выступленняў, якія ўчора прагучалі ў раздзеле «Рознае». Напрыклад, дэпутат Нісцюк зрабіў запыт Старшыні Вярхоўнага Савета Сямёну Шарэцкаму. Парламентарый звярнуў увагу сваіх калег, што апошнім часам у дзейнасці Вярхоўнага Савета назіраецца нямала хібаў. У прыватнасці, неаднаразова парушаўся Часовы рэгламент і Закон «Аб Вярхоўным Савеце». Такая практыка, лічыць сп. Нісцюк, сур'ёзна дэзарганізуе работу парламента. На сённяшні дзень у дэпутатаў нават няма пасведчанняў, ці, іншымі словамі, мандатаў.

Дбайна Вярхоўны Савет сочыць за асвятленнем яго дзейнасці сродкамі масавай інфармацыі. Так, гэтай тэме было прысвечана выступленне сп. Лябедзькі, які паведаміў, што 18 лютага ў тэлеперадачы «Рэзананс» журналіст Зімоўскі абвінаваціў парламент у карумпаванасці. З гэтай нагоды Лябедзька зрабіў афіцыйны запыт на імя в. а. Генеральнага пракурора сп. Капітана з мэтай высвятлення сітуацыі. «Адказнасць павінны несці дэпутаты, у дачыненні да якіх маюцца факты карупцыі, ці журналіст, які паклёпнічае на дэпутатаў», — заключыў сп. Лябедзька.

Цікавыя звесткі прывёў Анатоль Красуцкі. Згодна з яго словамі, у сакратарыят сесіі за час яе работы паступілі 324 лісты ад грамадзян. З іх 82 закранаюць праблемы сацыяльнага характару і пытанні працы. Шмат пісьмаў прысвечаны становішчу пенсіянераў, ветэранаў, удзельнікаў афганскай вайны і сем'яў воінаў-інтэрнацыяналістаў, чарнобыльскай тэматыцы. Ёсць шэраг слушных прапаноў у адрас сесіі.

Напрыклад, арганізацыя трансляцый па радыё і тэлебачанні пры абмеркаванні важных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краіны (на жаль, гэта здаецца недасягальным, паколькі сёння нават работа журналістаў не наладжана належным чынам: маніторы ў прэс-цэнтры, здаецца, патухлі раз і назаўсёды, таму мае калегі вымушаны слухаць трансляцыю па радыё, нават часта не ведаючы, хто аўтар прагучаўшых у зале пасяджэнняў слоў. — **Ю.Л.**). Звяртаюцца выбаршчыкі да парламента і з прапановай весці сесію і выступаць на беларускай мове.

Юрась ЛЯШКЕВІЧ.

АБАРОНЦАМ АЙЧЫНЫ!

Дарагія ветэраны, салдаты і сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь!

Горача і сардэчна віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь!

Дзень 23 лютага — гэта свята мужнасці і стойкасці, вернасці воінскаму абавязку, слаўным ваенным традыцыям, якія аб'ядноўваюць усе пакаленні абаронцаў Радзімы.

Дарагія ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сіл, партызаны і падпольшчыкі, у гады ваеннага ліхалецця вы прадэманстравалі ўсяму свету непахісную волю, імкненне да свабоды і незалежнасці ў барацьбе за вызваленне сваёй Айчыны. У час цяжкіх выпрабаванняў вы прынеслі незлічоныя ахвяры на алтар Перамогі ў імя міру і шчасця будучых пакаленняў.

Няхай слава вашых ратных подзвігаў не згасне ў вяках, няхай шчасцем і радасцю напоўняцца вашы дамы!

І няхай цяперашнія воіны, чыё свята мы адзначаем, служаць гэтак жа верна і аддана, шануюць свой воінскі абавязак, як іх бацькі і дзяды, і будуць стойкімі абаронцамі нашай роднай Беларусі і яе народа.

Са святам вас, абаронцы Айчыны! Поспехаў вам і ўдач у вашай ганаровай і адказнай службе!

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШАРЭЦКІ.

Напярэдадні Дня абаронцы Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у канцэртнай зале «Мінск» прайшоў вечар «Спяём, сябры». Любімыя песні для іх ветэранаў спявалі ў гэты вечар Аляксей Ісаеў, удзельнікі ансамбля «Вяселле» і іншыя вядомыя эстрадныя артысты. У вечары прынялі ўдзел кампазітары Ігар Лучанок, Эдуард Зарыцкі, Эдуард Ханок, Уладзімір Буднік, Валерый Іваноў і паэты-песеннікі Міхаіл Ясень, Рыгор Сакалоўскі.

Павіншаваць ветэранаў Узброеных Сіл з надыходзячым святам прыйшоў і Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Сямён Шарэцкі.

НА ЗДЫМКУ: Сямён ШАРЭЦКІ і Васіль НОВІКАЎ гутараць з ветэранамі.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БЕЛТА.

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

№ 79

Аб заснаванні ганаровых дзяржаўных сцягоў Рэспублікі Беларусь і зацвярджэнні Палажэння аб ганаровых дзяржаўных сцягах Рэспублікі Беларусь

Для заахвочвання за выдатныя дасягненні ў галіне дзяржаўнага, гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва, ва ўмацаванні праваапарадку і абараназдольнасці Рэспублікі Беларусь **пастанаўляю:**

1. Заснаваць ганаровыя дзяржаўныя сцягі Рэспублікі Беларусь.
2. Зацвердзіць прыкладзенае Палажэнне аб ганаровых дзяржаўных сцягах Рэспублікі Беларусь.
3. Кабінету Міністраў Рэспублікі Беларусь у месячны тэрмін вызначыць парадак выраба ганаровых дзяржаўных сцягоў Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

15 лютага 1996 г., г. Мінск.

ЗАЦВЕРДЖАНА Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 лютага 1996 г. № 79

ПАЛАЖЭННЕ

аб ганаровых дзяржаўных сцягах Рэспублікі Беларусь

1. Ганаровыя дзяржаўныя сцягі Рэспублікі Беларусь заснаваны як [illegible] за выдатныя дасягненні ў галіне дзяржаўнага, гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва, ва ўмацаванні праваапарадку і абараназдольнасці Рэспублікі Беларусь.

2. Ганаровыя дзяржаўныя сцягі Рэспублікі Беларусь прысуджаюцца прадпрыемствам, арганізацыям, установам, іншым юрыдычным асобам, а таксама адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам, воінскім часцям і падраздзяленням.

3. Хадайніцтвы аб прысуджэнні ганаровых дзяржаўных сцягоў Рэспублікі Беларусь [illegible]

Хадайніцтвы [illegible] разглядаюцца [illegible] Рэспублікі Беларусь, затым уносяцца Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

Хадайніцтвы аб прысуджэнні ганаровых дзяржаўных сцягоў Рэспублікі Беларусь абласцям, гарадам рэспубліканскага падпарадкавання, а таксама [illegible] уносяцца [illegible] Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

Прысуджэнне ганаровых дзяржаўных сцягоў Рэспублікі Беларусь можа ажыццяўляцца па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

4. Прысуджэнне ганаровых дзяржаўных сцягоў Рэспублікі Беларусь афармляецца Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [illegible]

5. Ганаровыя дзяржаўныя сцягі Рэспублікі Беларусь уручаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнню і ад яго імя:

прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь і яго намеснікамі;

кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і яго намеснікамі;

міністрамі, кіраўнікамі іншых цэнтральных органаў кіравання;

[illegible]

старшынямі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў.

6. Уручэнне ганаровых дзяржаўных сцягоў Рэспублікі Беларусь праводзіцца ва ўрачыстай абстаноўцы.

Ганаровыя дзяржаўныя сцягі Рэспублікі Беларусь застаюцца ў калектывах на пастаяннае захоўванне.

КРЫК ДУШЫ

У РАСІЮ НЕ ДАЕДУ, А Ў БЕЛАРУСІ — НІКОМУ НЕПАТРЭБНЫ

Не дай Бог нікому апынуцца ў такім становішчы, як я. 11 жніўня 1995 г. я трапіў пры выездзе з Мінска ў аўтакатастрофу. [illegible] пенсія 200.000 рублёў.

[illegible] у Расіі, куды ты трапляеш з 1991 года.

Да гэтага скончыў у 1972 г. [illegible] Дык што ж атрымліваецца? [illegible] Прашу апублікаваць пісьмо пра маё становішча. Мне 45 гадоў.

Анатоль МАРСКІ.

в. Федзюкі, Ляхавіцкі раён.

Міхаіл ЧЫГІР:

«ВІЗІТ ДЭЛЕГАЦЫІ БЕЛАРУСІ СТАЎ МАГУТНЫМ ШТУРШКОМ У РАЗВІЦЦІ СУПРАЦОЎНІЦТВА З БАЛГАРЫЯЙ»

Пра першы дзень афіцыйнага візіту прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Чыгіра ў Балгарыю перадае спецыяльны карэспандэнт «Звязды».

Ва ўрадавай рэзідэнцыі «Баяна» амаль адразу пасля ўрачыстай цырымоніі сустрэчы ў аэрапорце пачаліся перагаворы дэлегацый дзвюх краін. На парадак дня вынесена шмат актуальных для далейшага развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва пытанняў. Аб шматграннасці абмяркоўваемых праблем можна меркаваць хаця б і па саставу беларускай дэлегацыі. За стол перагавораў селі міністры сельскай гаспадаркі Васіль Ляонаў, адукацыі і навукі Васіль Стражаў, лясной гаспадаркі Валянцін Зорын, старшыня Белкаапсаюза Віктар Уладыка, першыя намеснікі міністраў замежных спраў і знешніх эканамічных сувязей адпаведна Валерый Цапкала і Альберт Дабрамудраў, першы намеснік міністра прамысловасці Уладзімір Галко, іншыя афіцыйныя асобы.

Сяброўскай, добразычлівай і адначасова дзелавой атмасферы перагавораў у пэўнай ступені садзейнічала і сама асоба 37-гадовага Жана Відэнава, старшыні Савета Міністраў Балгарыі. У свой час, а менавіта ў 1985 годзе, ён закончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносінаў атрымаў дыплом спецыяліста па знешняму гандлю. Таму размова двух кіраўнікоў урадаў была канкрэтнай і канструктыўнай і вялася пераважна аб шляхах хутчэйшай актывізацыі гандлёва-эканамічных сувязей, магчымасцях выкарыстання вялікіх рэзерваў, якія пакуль па розных, аб'ектыўных і суб'ектыўных, прычынах не выкарыстоўваліся. У выніку чаго Беларусь і Балгарыя неслі вялікія страты замест атрымання прыбыткаў, ідавочных выгод. Таму і Міхаіл Чыгір, і Жан Відэнаў былі аднадушныя ў думцы, што надышоў час узняць беларуска-балгарскія адносіны на якасна новы ўзровень, які адпавядаў бы патэнцыялу дзвюх краін, спадчыне нашых народаў.

Балгарыя, як і Беларусь, імкнецца пашыраць экспарт сваіх тавараў не толькі на Захад, але і на рынкі краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Балгарыя сёння поўная рашучасці вярнуцца зноў са сваёй прадукцыяй у ранейшых аб'ёмах, а пры магчымасці — нават пераўзысці іх, у былыя рэспублікі СССР. І Беларусь у гэтым кантэксце здаецца ім вельмі прывабнай дзяржавай.

Як сказаў пасля перагавораў Міхаіл Чыгір, літаральна з першых крокаў на балгарскай зямлі беларуская дэлегацыя адчула шчырасць і сардэчную цеплыню да сябе, што ў значнай ступені спрыяла тону і зместу размовы.

З улікам крызіснага стану эканомікі дзвюх краін мы дамовіліся ўзяць канкрэтныя і вельмі важныя накірункі нашага супрацоўніцтва пад урадавы кантроль з кожнага боку. Гэтыя накірункі будуць вызначаны ў ходзе перагавораў паміж прадстаўнікамі міністэрстваў і ведамстваў, адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі.

У другой палове дня члены беларускай дэлегацыі былі прыняты акадэмікам Благавестам Сендавым, Старшынёй Народнага сходу Балгарыі. Ён, дарэчы, некалі ў маладыя гады наведваў Беларусь, праходзіў стажыроўку на адным з мінскіх заводаў, дзе ствараліся ЭВМ. Таксама дэлегацыя ўсклала вянок да помніка Невядомаму салдату, наведала сабор Аляксандра Неўскага, пасольства Беларусі ў Сафіі.

ПАДПІСАНЫ ШЭРАГ ВАЖНЫХ ПАГАДНЕННЯЎ

Учора завяршыўся афіцыйны візіт прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра ў Балгарыю.

Кульмінацыйным пунктам знаходжання беларускай урадавай дэлегацыі стала падпісанне ў рэзідэнцыі «Баяна» шэрага пагадненняў, якія сталі значным крокам у далейшым паглыбленні эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

Міхаіла Чыгіра прыняў прэзідэнт Балгарыі Жэлю Жэлеў. Адбылася зацікаўленая размова аб перспектывах палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва. Прэзідэнт і прэм'ер-міністр абмяняліся думкамі наконт важных падзей у свеце.

Таксама беларуская дэлегацыя наведала кансорцыум «Электрон» — вядучае прадпрыемства па выпуску электроннай прадукцыі ў Балгарыі, з якім намячаецца далейшае пашырэнне кантактаў. Адбылася сустрэча з прадстаўнікамі дзелавых колаў краіны.

Больш падрабязна аб візіце ў адным з наступных нумароў «Звязды».

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ДА ЎВАГІ ПАШТАЛЬЁНАЎ!

Рэдакцыя павялічыла памер прэміяльнага фонду.

Рэдакцыя газеты «Звязда» вырашыла прэміраваць паштовыя аддзяленні рэспублікі, якія дасягнуць найлепшых вынікаў падпіскі на нашу газету на II квартал 1996 года.

Умовы гэтага конкурсу даволі простыя: за найбольшы колькасны прырост падпіскі адносна I квартала гэтага года вызначаны тры асноўныя прэміі.

1-я прэмія — 3 мільёны рублёў; 2-я прэмія — 2,5 мільёна рублёў; 3-я прэмія—2 мільёны рублёў. Устаноўлена дзесяць заахвочвальных прэмій па 300.000 рублёў кожная.

Пераможцаў конкурсу па выніках падпіскі вызначыць ДАП «Мінская пошта». Паштовыя аддзяленні, якія перамаглі ў конкурсе, будуць названы ў газеце.

Рэдакцыя газеты «Звязда».

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ:

«У ГАНОВЕРЫ МЫ ПАВІННЫ ПАКАЗАЦЬ МАГЧЫМАСЦІ БЕЛАРУСІ»

Наша рэспубліка ўпершыню прыме ўдзел у веснавым універсальным кірмашы, які праводзіцца з 22 па 27 красавіка бягучага года ў нямецкім горадзе Гановеры. Гэта падзея стане шырокай прэзентацыяй суверэннай Беларусі. На кірмашы будзе разгорнута вялікая экспазіцыя айчыннай навукаёмістай прадукцыі, новых тэхналогій і тэхнікі. У рамках гэтага міжнароднага форуму дзелавых людзей плануецца Дзень беларуска-германскай эканомікі, арганізуецца 4-е пасяджэнне германа-беларускага савета эканамічнага супрацоўніцтва.

Карэспандэнт БЕЛТА сустрэўся з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Міхаілам Мясніковічам і папрасіў яго расказаць аб ходзе падрыхтоўкі беларускага боку да ўдзелу ў міжнародным універсальным кірмашы.

— Міхаіл Уладзіміравіч, Рэспубліка Беларусь даволі часта арганізуе за мяжой нацыянальныя экспазіцыі. Толькі ў мінулым годзе іх было 12. Якія адрозненні і асаблівасці маюць адбыцца прэзентацыі рэспублікі на Гановерскім кірмашы?

— Сапраўды, комплекс мерапрыемстваў па прадстаўленню Рэспублікі Беларусь на буйнейшым у свеце Гановерскім кірмашы будзе мець важнейшае, калі не сказаць гістарычнае, значэнне для Беларусі.

Запрашэнне нашай рэспубліцы ажыццявіць шырокую прэзентацыю ў цэнтры Еўропы стала магчымым дзякуючы намаганням дзяржаўных органаў, мэтанакіраванай рабоце прадпрыемстваў, а таксама імкненню германа-беларускага эканамічнага савета да расшырэння супрацоўніцтва Беларусі і Германіі.

Заслугоўвае асаблівай увагі, па-першае, сам факт таго, што нашай рэспубліцы быў дадзены шанц прадэманстраваць усяму свету свае дасягненні, у той час як многія буйныя замежныя дзяржавы стаяць у Гановеры ў чарзе на атрыманне такой магчымасці на працягу 10—15 гадоў.

Па-другое, такія мерапрыемствы праводзяцца на самым высокім узроўні: афіцыйную дэлегацыю краіны — арганізатара Дзён узначальвае, як правіла, прэзідэнт або прэм'ер-міністр. Іх наведваюць высокія афіцыйныя асобы з многіх краін свету з мэтай правядзення перагавораў, ад якіх краіна-арганізатар атрымлівае не толькі эканамічныя, але і палітычныя дывідэнды. А ў бягучым годзе на адкрыцці кірмашу будуць прысутнічаць віцэ-прэзідэнт ЗША Альберт Гор, прэзідэнт Федэратыўнай Рэспублікі Германіі Раман Херцаг і іншыя высокія афіцыйныя асобы. Прадугледжваецца, што афіцыйную дэлегацыю нашай рэспублікі ўзначаліць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Па-трэцяе, гэту падзею будуць асвятляць каля 6 тысяч журналістаў, акрэдытаваных на Гановерскі кірмаш. Гэта больш, чым пры асвятленні Алімпійскіх гульняў. На кірмашы ў Гановеры чакаецца каля 400 тысяч наведвальнікаў.

— Якая прадукцыя беларускіх прадпрыемстваў будзе прадстаўлена ў Гановеры?

— Экспазіцыя Рэспублікі Беларусь будзе размяшчацца на плошчы каля 350 квадратных метраў у чатырох спецыялізаваных павільёнах.

У павільёне навукі і новых тэхналогій будуць дэманстравацца навуковыя распрацоўкі 24 навуковых устаноў рэспублікі. Такіх, напрыклад, як Інстытут фізіка-арганічнай хіміі, Інстытут фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, Фізіка-тэхнічнага інстытута, Інстытута цепла- і масаабмену, Інстытута надзейнасці машын і шэрага іншых.

У павільёнах 19 і 20 беларускай экспазіцыі будзе прадстаўлена прадукцыя 28 прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі. Сярод іх ВА «БелВАР», Віцебскае ВА «Маналіт», ААТ «Пеленг», АТ «Электрамодуль», канцэрн «Планар», Кобрынскі і Аршанскі інструментальныя заводы і іншыя прадпрыемствы.

У пятым павільёне, у якім арганізуецца Міжнародны інфармацыйны форум «Усход—Захад», канцэнтруецца інфармацыя аб стане і перспектывах развіцця

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Вызваліць Багданкевіча Станіслава Антонавіча ад пасады старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у сувязі з выхадам у адстаўку згодна з артыкулам 22 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах службы ў дзяржаўным апараце» з 10 верасня 1995 года.

2. Да выбрання Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь функцыі старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь выконвае першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Кузьміч Мікалай Андрэевіч (артыкул 7 Статута Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШАРЭЦКІ

20 лютага 1996 г., г. Мінск., № 83-XIII.

Уладзімір СЯНЬКО: «АДНОСІНЫ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І РАСІЯЙ РАЗВІВАЮЦЦА ПАСПЯХОВА, ХОЦЬ І НЯПРОСТА»

З міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам СЯНЬКО гутарыць карэспандэнт «Інтэрфакса» Вячаслаў ЗЯНЬКОВІЧ

— Уладзімір Лявонавіч! Як бы вы ахарактарызавалі сённяшняе становішча беларуска-расійскіх адносін? Асабліва цікава было б пачуць вашу ацэнку іх развіцця пасля стварэння ў студзені мінулага года мытнага саюза дзвюх краін, а таксама — ліквідацыі кантрольна-прапускных пунктаў на граніцы паміж імі.

— Наогул, адносіны паміж Беларуссю і Расіяй развіваюцца паспяхова, хоць і няпроста.

Яшчэ некалькі гадоў таму цяжка было ўявіць, што пасля распаду Савецкага Саюза ў 1991 годзе працэс «збірання камянёў» будзе праходзіць так цяжка. [illegible]

[illegible]

Год таму ў ходзе візіту ў Мінск прэзідэнта Расіі Б. Ельцына быў зроблены значны крок на шляху да эканамічнай інтэграцыі. [illegible] Аднак, на мой погляд, галоўная, эканамічная мэта стварэння мытнага саюза дасягнута не была. [illegible]

Прычын таму шмат. [illegible] Думаю, пакуль не можа быць размовы пра якія-небудзь рэвалюцыйныя, радыкальныя перамены.

Разам з тым лічу, што прызначаны на канец лютага першы афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі А. Р. Лукашэнкі ў Расію значна паўплывае на далейшы характар двухбаковых адносінаў.

Радуе тое, што падрыхтоўка візіту ідзе [illegible]

[illegible] Агульная сума ўзаемнай завінавачанасці перавышае адзін мільярд долараў.

— З пункту гледжання кіраўніка знешнепалітычнага ведамства, як вы ацэньваеце ход выканання абедзвюма краінамі абавязацельстваў пагаднення аб стварэнні мытнага саюза Беларусі і Расіі?

— Вядома, мэта зразумелая. [illegible]

[illegible] цяга разу...

Для мяне зусім відавочна, што альтэрнатывы развіццю цесных беларуска-расійскіх адносінаў няма. Няма альтэрнатывы і развіццю цеснага супрацоўніцтва з іншымі незалежнымі дзяржавамі, якія ўзніклі ў выніку распаду СССР.

— У чым жа галоўныя праблемы дыялогу паміж Масквой і Мінскам? Беларусь адчувае «ціск» з боку супердзяржавы?

— Праблемы існуюць выключна [illegible].

[illegible] на мой погляд, было [illegible] ведамстваў.

— У дыялогу з Расіяй беларускі бок мае «ў запасе» [illegible] варыянт уступкі? [illegible] «запасам» [illegible] аб'екты — Ганцавіцкая радыелакацыйная станцыя і пункт сувязі па кіраванню атамным падводным флотам Расіі на Балтыцы і ў Паўночнай Атлантыцы...

— Не думаю, што ў ходзе перагавораў з Расіяй заўсёды [illegible] мець «у запасе» [illegible]

[illegible] пакуль адсутнічае разуменне гэтага [illegible]

— [illegible] плату за стратэгічнае партнёрства па прыкладу [illegible] СССР і Фінляндыі, калі Масква стварала для гэтай скандынаўскай краіны [illegible] ўмовы [illegible] супрацоўніцтва?

— [illegible] прыкладаў тут, [illegible] беларуска-расійскіх [illegible]. Разам з тым, [illegible] Беларусі і Расіі [illegible] у дадзеным [illegible] нейкія аналогіі.

— Стратэгічнае супрацоўніцтва з Расіяй для Беларусі, на ваш погляд, безальтэрнатыўнае? Ці магчымы якія-небудзь іншыя варыянты ў выпадку, калі Масква паранейшаму будзе не зусім разумець значнасць ролі партнёрства з Беларуссю?

— У эканамічных адносінах у Беларусі шырокай палітры альтэрнатыўных варыянтаў няма. Наша рэспубліка ў апошнія гады вяла свядомую лінію на эканамічную інтэграцыю з Расіяй. Пошукі альтэрнатыўных партнёраў вельмі цяжкія, хоць бы таму, што многія віды прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў па якасных характарыстыках і тэхналагічным узроўні пакуль адрозніваюцца ад аналагаў заходняй вытворчасці. Акрамя таго, заходні рынак збыту даволі жорстка размеркаваны паміж мясцовымі суб'ектамі гаспадарання. Існуюць шматлікія квоты, якія перашкаджаюць рэалізацыі беларускіх тавараў на заходнім рынку.

У той жа час любая дзяржава не можа ў доўгатэрміновым плане абапірацца толькі на аднаго партнёра. Не выпадкова, што менавіта таму кіраўніцтва Беларусі свядома праводзіць курс на дасягненне ў перспектыве збалансаванасці асноўных вектараў нашай знешняй палітыкі.

— Як вы лічыце, напярэдадні візіту Прэзідэнта Беларусі ў Расію ў Крамлі з'явілася разуменне неабходнасці «плаціць» за стратэгічнае партнёрства з Беларуссю?

— Даць дакладную ацэнку тут цяжка. Думаю, парасткі такога разумення будуць набіраць сілу.

— У Расіі бытуе папулярная прыказка: «Гром не грымне — мужык не перахрысціцца». Можа, Беларусі трэба было праз якую-небудзь акцыю даць Расіі зразумець, што неабходна плаціць за стратэгічнае партнёрства? І калі Масква не зразумее гэтага, то Беларусь можа пашукаць сабе іншага партнёра ў асобе адной з краін НАТО?

— Не думаю, што адна або дзве акцыі прывядуць да разумення Расіяй неабходнасці адпаведным чынам «цаніць» стратэгічнае партнёрства з Беларуссю. Гэтаму можа садзейнічаць толькі зразумелая і настойлівая пазіцыя Мінска, якая мэтанакіравана, настойліва і паслядоўна будзе выказвацца нашым партнёрам у Расіі ў ходзе перагаворнага працэсу.

— Вам не здаецца, што заявы лідэраў шэрага ўсходнееўрапейскіх дзяржаў аб намеры ўступіць у НАТО палітычна выгадныя Беларусі, бо гэта прымушае Маскву задумацца над праблемамі стратэгічнага партнёрства з Беларуссю? Калі Беларусь сапраўды стане буфернай зонай паміж Расіяй і Захадам, тады, магчыма, Расія ўсвядоміць неабходнасць платы за супрацоўніцтва...

— Калі Расія стане эканамічна квітнеючай дзяржавай, будзе прасцей вырашаць праблемы...

Што ж датычыць перспектыў пашырэння НАТО, то, упэўнены, расійскія ваенныя ўжо сёння выдатна разумеюць, што азначае Беларусь з пункту гледжання стратэгічнай расстаноўкі сіл у Еўропе.

— Уладзімір Лявонавіч! З дня белавежскага самміта 1991 года кіраўнікі як Беларусі, так і Расіі пастаянна гавораць аб неабходнасці інтэграцыі. Тым не менш, калі ў 1991 годзе Беларусь пастаўляла амаль 80 працэнтаў выробленай у сябе прадукцыі ў Расію, то ў 1995 годзе гэты паказчык упаў прыкладна да 50 працэнтаў. Многія з заключаных двухбаковых пагадненняў на практыцы не выконваюцца. Ці не з'яўляюцца фанфары інтэграцыі шырмай для ажыццяўлення цывілізаванага «бракаразводнага працэсу»?

— Было б няправільна характарызаваць беларуска-расійскія адносіны як рэінтэграцыйныя. Паўтараю: гаворка ідзе менавіта аб эканамічнай інтэграцыі ў першую чаргу. Не думаю, што расіяне або беларусы скарыстоўваюць, як вы выказаліся, «фанфары інтэграцыі» для разводу... Проста ніхто ў 1991 годзе не чакаў, што пошук новай платформы сувязей двух бакоў будзе настолькі цяжкім.

Цяпер, напрыклад, ужо немагчыма адрадзіць ранейшую, агульнасаюзную схему работы гіганта айчыннай індустрыі — Мінскага трактарнага завода. Вельмі розныя ў рэспублік былога СССР цяпер заканадаўствы і эканамічныя ўмовы гаспадарання...

Супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў, эканомікі якіх знаходзяцца ў крызісных сітуацыях, заўсёды больш складанае, чым узаемадзеянне эканамічна развітых краін.

— У ходзе свайго нядаўняга двухдзённага афіцыйнага візіту ў Мінск міністр замежных спраў Расіі Я. Прымакоў на сустрэчах з журналістамі некалькі разоў паўтарыў фразу аб немагчымасці аднаўлення СССР «у тым выглядзе, у якім ён існаваў». На ваш погляд, чаму кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Расіі заяўляў аб гэтым менавіта ў Мінску і ці не азначаюць яго словы, што Савецкі Саюз можа быць адноўлены «не ў тым выглядзе, у якім існаваў»?

— Ніхто сёння не скажа, ні ўслых, ні сам сабе, аб магчымасці стварэння канфедэратыўнай або федэратыўнай дзяржавы, якая будзе складацца з Расіі і іншых краін Садружнасці. Гэта зараз нерэальна. Беларускае кіраўніцтва не праводзіць лінію на стварэнне унітарнай дзяржавы на базе постсавецкіх рэспублік. Упэўнены, што такую лінію не праводзіць і Расія...

ТРЫБУНА ДЭПУТАТА

ЗАХАВАЦЦА СЯРОД РАЗВІТЫХ КРАІН МЫ ЗМОЖАМ ТОЛЬКІ ПРАЗ НАВУКУ

Эканоміка краіны залежыць ад шэрага фактараў; найбольш значны з іх — адукацыйна-навуковы.

Гэта даказана сусветнай практыкай.

Напрыклад, у ЗША палітыкі кіруюцца наступнымі арыенціровачна-колькаснымі паказчыкамі:

1 долар, укладзены ў адукацыю і навуку, з часам вяртаецца грамадству 5-ю доларамі;

з 1948 па 1982 год валавы нацыянальны прадукт у ЗША ўзрастаў у сярэднім у год на 3,2 працэнта; лічыцца, што 80 працэнтаў гэтага прыросту забяспечвалася прыростам адукацыйна-навуковага ўзроўню насельніцтва.

Няма і японскага цуда (пра якое шмат эмацыянальна гавораць і пішуць). Але быў 1945-ы год, атамныя бамбардзіроўкі Хірасімы і Нагасакі, паражэнне ў вайне, а ў Краіне ўзыходзячага сонца прымалі закон аб усеагульнай бясплатнай дзевяцігадовай адукацыі. І выканалі яго. Ды так, што ў 1975 годзе 98 працэнтаў дарослай японскай моладзі мела адукацыю не ніжэй дванаццацігадовай (адпаведна рос і навуковы патэнцыял):

Адукацыйна-навуковы комплекс выкарыстоўваўся для пад'ёму эканомікі і ў Савецім Саюзе — лічылася, што 1 рубель, укладзены ў пашырэнне сродкаў вытворчасці, аднаўляе сябе і павышае нацыянальны даход на 39 капеек; але той жа рубель, укладзены ў навуку і асваенне яе вынікаў, прырошчвае нацыянальны даход на 1 рубель 45 капеек.

Сёння ў Беларусі навукова-тэхнічны прагрэс пачаў прабуксоўваць. Прычына гэтага — разбурэнне міжгаспадарчых сувязей, абумоўленае развалам СССР.

На жаль, па законах усеагульнага хаосу пайшла і наша ўнутраная палітыка. Выканаўчыя і заканадаўчыя ўлады не зразумелі (не разумеюць і дагэтуль), што **пры неразвітых сыравіннай і паліўна-энергетычнай базах адзіным выратаваннем для Беларусі** (выратаваннем ад пераходу з ліку развітых краін у згуртаванне бананавых рэспублік) **з'яўляецца неадкладная перагрупоўка і перапрафіляванне навукова-даследчых сіл, іх старанная дзяржаўная апека з мабілізацыяй на работу ў новых умовах**. Замест гэтага высакаякасны навуковы патэнцыял Рэспублікі Беларусь пачаў (і працягвае) знішчацца — за апошнія 4 гады колькасць навуковых кадраў у Беларусі зменшылася больш чым у 2 разы; артыкулам 7 «Закона Рэспублікі Беларусь аб дзяржаўным бюджэце на 1996 год» Кабінет Міністраў мяркуе на фінансаванне навукі адвесці 0,58 працэнта ад нашага, беднага беларускага ВУП, што ў 4-5 разоў менш, чым гэта прынята ў авангардных краінах (гл. табліцу).

ФІНАНСАВАННЕ НАВУКІ Ў АВАНГАРДНЫХ КРАІНАХ
(у % ад іх нацыянальных ВУП)

Гады	ЗША	ФРГ	Францыя	Англія	Японія	Нідэрланды	Швейцарыя	Швецыя
1981	2,45	2,43	1,97	2,41	2,32	1,88	2,29	2,30
1983	2,71	2,52	2,11	2,25	2,55	2,02	2,28	2,56
1985	2,93	2,72	2,25	2,31	2,77	2,09	?	2,89
1987	2,87	2,88	2,27	2,25	2,82	2,33	?	3,00
1989	2,80	2,88	2,34	2,24	2,98	2,16	2,86	2,85
1991	2,78	2,66	2,42	2,26	3,07	2,06	?	2,54

У СССР на навуковыя даследаванні адводзілася ад 3,5 да 4 працэнтаў ВУП.

Міжнацыянальная акадэмія навук краін СНД лічыць (1996 год): **на фінансаванне навукі павінна адводзіцца не менш як 3 працэнты нацыянальнага ВУП.**

Каб навукова-тэхнічныя сілы Рэспублікі Беларусь зноў пачалі працаваць на эканоміку сваёй краіны, мэтазгодна, на нашу думку, прытрымлівацца наступных сямі прынцыпаў:

1. 60—70 працэнтаў бюджэтнага фінансавання, адводзімага на навуку, павінна накіроўвацца на даследаванні, што заканчваюцца асвоенымі ў вытворчасці новымі відамі тыварнай прадукцыі для знешняга рынку;

2. Аднавіць прынцып канцэнтрацыі навукова-тэхнічных сіл, — лепш мець у дзесяць—дваццаць разоў меншую колькасць тэм, але выконваць іх хутка і з давядзеннем вынікаў да канкрэтнага прамысловага выкарыстання;

3. Трэба паставіць з галавы на ногі фарміраванне дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм і праектаў — дзяржаўныя спецыялісты знешняга гандлю, улічваючы канкрэтныя ўмовы Беларусі, павінны выбраць дзесяць—трыццаць назваў тавараў (магчыма, трактары; можа быць, прадукты глыбокай перапрацоўкі сваёй сыравіны — калійныя солі, торф і г. д.), якія карыстаюцца шырокім попытам на сусветным рынку; натуральна, павінны быць зададзены тэхнічныя характарыстыкі і цэны такіх тавараў; гэта і будуць прапановы-эталоны навуковай прадукцыі, якія павінны прымаць, ці спаборнічаць з імі вучоныя-арганізатары, якія ўдзельнічаюць у конкурсе на атрыманне фінансуемых дзяржавай праграм і праектаў;

4. Зламаць існуючы бар'ер паміж навукай і вытворчасцю — у распараджэнне вучонага-арганізатара дзяржава павінна прадастаўляць патрэбны яму мінімум вытворчых магутнасцей (цэх, завод і г. д.) і надзяляць правам вызваляць кіруючых асоб ад займаемых імі пасад у выпадках цяганіны і тэхналагічнай невыканальнасці; прыклады Каралёва і Тупалева пацвярджаюць мэтазгоднасць надзялення вучоных-арганізатараў такімі паўнамоцтвамі; наш ДКНТ павінны складацца, у асноўным, з такіх вучоных-арганізатараў;

5. Варта аднавіць прынцып адказнасці спецыяліста за выдаваемыя ім рэкамендацыі — пры размеркаванні пасад адукацыйныя ўзроўні і вучоныя ступені павінны ўлічвацца, але за авантурызм трэба расплачвацца; калі спецыяліст бярэцца за выкананне сфармуляванай яму задачы, дык справай гонару павінна з'яўляцца і прыняцце на сябе адпаведных пісьмовых абавязацельстваў тыпу: «у выпадку, калі я не вырашу ўзятую на сябе задачу, дык... буду лічыць справядлівым ануляванне майго дыплома аб вышэйшай адукацыі (ці — буду лічыць справядлівым ануляванне вучонай ступені доктара навук; ці — і ўнясу ў бюджэт дзяржавы такую вось суму штрафу)» такая заява будзе з'яўляцца падставай пры неабходнасці прыняцця ў судзе адпаведнага рашэння;

6. Не трэба забываць, што беларусаў у сусветным супольніцтве менш як 0,2 працэнта і шырокім фронтам весці фундаментальныя даследаванні мы не ў стане; тыя 30—40 працэнтаў, пра якія ўпамянёна ў п. 1, мэтазгодна выкарыстаць, у асноўным, на падтрымку піянерных навуковых школ і напрамкаў; пры гэтым нельга апраўдаць сённяшнюю нашу палітыку, калі за тысячу долараў айчынныя фундаментальшчыкі і пошукавікі раскрываюць (праз справаздачы) свае франты даследаванняў Сорасу і іншым «дабрадзеям»; гэта палітыка на знішчэнне беларускіх галін сусветнай фундаментальнай навукі — «бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы»;

7. Аднавіць прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці насельніцтва вучыцца і займацца навукова-тэхнічнай дзейнасцю, — ці ж гэта справа, калі сярэдняя заработная плата прафесара, доктара навук ніжэй за сярэднедзяржаўную; калі кандыдат сельскагаспадарчых навук, які паспяхова працуе над доктарскай дысертацыяй, каб забяспечыць сям'ю, вымушаны пераходзіць у пуцявыя рабочыя; калі спецыяліст, які заканчвае з адзнакай інстытут, пакідае сваю інжынерную дзейнасць і пераходзіць у бетоншчыкі; калі дрэннае матэрыяльнае становішча прымушае дацэнта займацца спекуляцыйна-чаўночнай дзейнасцю; неабходна тэрмінова спыніць працэс знішчэння інтэлекту беларускай нацыі; для гэтага, у прыватнасці, бюджэтам на 1996 год на навуку трэба выдзеліць не менш як 2,57 трыльёна рублёў (што складае ўсяго 1,5 працэнта ад нашага ВУП). Будзем спадзявацца, што ў памеры 1,5 працэнта ад ВУП навуку будуць непасрэдна фінансаваць яшчэ і нашы прадпрыемствы.

Руслан ІГНАЦІШЧАЎ,
дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, старшыня падкамісіі па навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу, доктар тэхнічных навук, прафесар.

ЗАЦВЕРДЖАНА Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 лютага 1996 г. № 63

ПАЛАЖЭННЕ АБ ПРЭЗІДЭНЦКІМ САВЕЦЕ

1. Прэзідэнцкі савет з'яўляецца пастаянна дзеючым кансультатыўным органам пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

2. Прававую аснову дзейнасці Прэзідэнцкага савета складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, законы Рэспублікі Беларусь, указы і распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама гэтае Палажэнне.

3. Асноўнай задачай Прэзідэнцкага савета з'яўляецца распрацоўка прапаноў па фарміраванню і рэалізацыі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, удасканаленню механізма ажыццяўлення стратэгіі агульнанацыянальнага развіцця Рэспублікі Беларусь, павышэнню эфектыўнасці дзейнасці органаў выканаўчай улады.

4. Дзейнасцю Прэзідэнцкага савета кіруе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

5. Члены Прэзідэнцкага савета зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь з ліку вядомых вучоных, аўтарытэтных грамадскіх дзеячаў, кіраўнікоў палітычных партый і рухаў, грамадскіх і рэлігійных аб'яднанняў і прымаюць удзел у яго рабоце на грамадскіх асновах.

6. Прэзідэнцкі савет ажыццяўляе сваю дзейнасць зыходзячы з ускладзеных на яго задач.

7. Пасяджэнні Прэзідэнцкага савета праводзяцца пад старшынствам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, як правіла, не радзей аднаго разу ў месяц.

8. Для падрыхтоўкі пасяджэнняў і разглядаемых на іх пытанняў, правядзення экспертных і аналітычных работ Прэзідэнцкі савет можа ствараць рабочыя групы.

Стварэнне рабочых груп афармляецца распараджэннямі кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

9. Інфармацыйна-аналітычнае забеспячэнне дзейнасці Прэзідэнцкага савета ажыццяўляецца структурнымі падраздзяленнямі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

10. Арганізацыйна-тэхнічнае забеспячэнне пасяджэнняў Прэзідэнцкага савета ўскладаецца на сакратарыят Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗАЦВЕРДЖАНА Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 лютага 1996 г. № 63

ПАЛАЖЭННЕ АБ САВЕЦЕ КІРАЎНІКОЎ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ ВЫКАНАЎЧАЙ УЛАДЫ ПРЫ ПРЭЗІДЭНЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1. Савет кіраўнікоў мясцовых органаў выканаўчай улады пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (далей — Савет) з'яўляецца пастаянна дзеючым кансультатыўным органам пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, які забяспечвае ўзаемадзеянне рэспубліканскіх і мясцовых органаў выканаўчай улады.

2. Прававую аснову дзейнасці Савета складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, законы Рэспублікі Беларусь, указы і распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама гэтае Палажэнне і іншыя нарматыўныя акты.

3. Асноўнымі задачамі Савета з'яўляюцца:

распрацоўка прапаноў па каардынацыі дзейнасці мясцовых органаў выканаўчай улады па рэалізацыі дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі, выкананню рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх праграм;

забеспячэнне адзінства дзеянняў цэнтральных і мясцовых органаў выканаўчай улады па пытаннях сацыяльнай абароны насельніцтва;

забеспячэнне збалансаванага падыходу і ўліку рэгіянальных інтарэсаў пры падрыхтоўцы важнейшых сацыяльна-эканамічных рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

выпрацоўка прапаноў па карэкціроўцы дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі з улікам вопыту яе рэалізацыі ў рэгіёнах.

4. Старшынёй Савета з'яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

5. У састаў Савета ўваходзяць кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, старшыні абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў.

6. Распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь членамі Савета тэрмінам на адзін год зацвярджаюцца старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў (па два ад кожнай вобласці і адзін прадстаўнік ад мясцовага органа кіравання г. Мінска).

7. Савет ажыццяўляе сваю дзейнасць зыходзячы з ускладзеных на яго задач.

8. Пасяджэнні Савета праводзяцца пад старшынствам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не радзей аднаго разу ў квартал.

9. Для прапрацоўкі пытанняў, падрыхтоўкі пасяджэнняў, правядзення экспертных і аналітычных работ Савет можа ствараць рабочыя групы.

Стварэнне рабочых груп афармляецца распараджэннямі кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

10. Інфармацыйна-аналітычнае забеспячэнне Савета ажыццяўляецца Галоўным упраўленнем грамадска-палітычнай інфармацыі і Галоўным упраўленнем эканамічнага развіцця і прагнозу Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

11. Арганізацыйна-тэхнічнае забеспячэнне пасяджэнняў Савета ўскладаецца на аддзел арганізацыйнага забеспячэння сакратарыята Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПАСТАНОВА
КАБІНЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 89
АБ МІЖНАРОДНЫМ АРБІТРАЖНЫМ СУДЗЕ ПРЫ БЕЛАРУСКАЙ ГАНДЛЁВА-ПРАМЫСЛОВАЙ ПАЛАЦЕ

Прызнаючы неабходнасць наяўнасці ў Рэспубліцы Беларусь Міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда як адной з асноўных умоў ажыццяўлення знешнеэканамічнай дзейнасці і ў мэтах выканання прынятых рэспублікай міжнародных абавязацельстваў, Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе**:

1. Прыняць да ведама, што:

1.1. Міжнародны арбітражны суд пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце з'яўляецца пастаянна дзеючым недзяржаўным, незалежным органам, які ажыццяўляе правасуддзе на асновах самаакупнасці.

Дзейнасць Міжнароднага арбітражнага суда рэгулюецца нормамі міжнароднага права, а таксама рэгламентам, які зацвярджаецца Беларускай гандлёва-прамысловай палатай;

1.2. Міжнародны арбітражны суд разглядае:

спрэчкі паміж любымі суб'ектамі /акрамя дзяржаў/, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні знешнеэканамічных і іншых міжнародных сувязей, калі месца знаходжання ці месца жыхарства хоць бы аднаго з іх знаходзіцца за мяжой;

спрэчкі паміж замежнымі суб'ектамі гаспадарання.

Міжнародны арбітражны суд разглядае таксама спрэчкі, якія адносяцца да яго юрысдыкцыі ў выніку закона або міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь.

2. Устанавіць, што ў адпаведнасці з міжнароднымі абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь рашэнні Міжнароднага арбітражнага суда пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце прыводзяцца ў выкананне на тэрыторыі рэспублікі праз сістэму дзяржаўных судоў у парадку, вызначаным Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь і Канвенцыяй аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне замежных арбітражных рашэнняў (г.Нью-Йорк, 1958 год).

3. Рэкамендаваць:

Беларускай гандлёва-прамысловай палаце стварыць у якасці структурнага падраздзялення Міжнароднага арбітражнага суда Марскую арбітражную камісію для разгляду спрэчак, звязаных з марскімі перавозкамі;

міністэрствам, іншым цэнтральным органам кіравання аказваць садзейнічанне Міжнароднаму арбітражнаму суду ў ажыццяўленні яго дзейнасці.

4. Міністэрству юстыцыі сумесна з Міністэрствам замежных спраў, Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і іншымі зацікаўленымі ў 3-месячны тэрмін распрацаваць і ўнесці ва ўстаноўленым парадку ў Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь праект закона Рэспублікі Беларусь «Аб Міжнародным арбітражным судзе».

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь
М. ЧЫГІР.

12 лютага 1996 г., г.Мінск.

«ПАРТЫЗАНСКІМІ СЦЕЖКАМІ»
ДАВОДЗІЦЦА НАВЕДВАЦЬ СУСЕДЗЯЎ ЖЫХАРАМ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАГА ПАМЕЖЖА

У свой час назва чыгуначнай станцыі Гадуцішкі не сыходзіла са старонак газет. Нарэшце беларускі і літоўскі бакі знайшлі пэўнае паразуменне ў вызначэнні прыналежнасці гэтай станцыі, якая апынулася на самай мяжы. Але, як гэта часта ў нас бывае, прынятыя міждзяржаўныя пагадненні не поўнасцю ўлічваюць інтарэсы людзей, якія жывуць каля станцыі, у бліжэйшым наваколлі, карыстаюцца ёю.

У «Звязду» звярнуліся жыхары Камайскага і Магунскага сельскіх Саветаў Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці: Саветы гэтыя сёння ўваходзяць у прыгранічную зону, маюць, адпаведна, свой статус. І вось жыхары двух дзесяткаў вёсак, якія ляжаць у непасрэднай блізкасці да станцыі Гадуцішкі, у чарговы раз просяць дапамогі.

Як ужо шмат пісалася, сама гэта станцыя знаходзіцца непасрэдна на мяжы. А за нейкіх дзвесце метраў ад яе — пераход «Крукі». Тут дзяжураць літоўская варта, нашы пагранічнікі. Натуральны шлях беларуса, які сёння жыве ў Літве, Латвіі ці Калінінградскай вобласці і не мае ўласнага аўтамабіля, быў бы такі: на цягніку да станцыі Гадуцішкі, і праз пераход «Крукі» — на тэрыторыю бацькаўшчыны.

Тут ужо да бліжэйшых вёсак можна дабірацца і пешшу, а можна папярэдзіць сваякоў, і тыя пад'едуць сустрэць госця на кані...

Але справа ў тым, што пераход «Крукі» існуе для спрошчанага пераходу мяжы — жыхары наваколля маюць права ў выхадныя дні і ў пятніцу пасля абеду пераходзіць гэту мяжу без візаў. Таму ж, хто дабіраецца на радзіму бацькоў з візай, праходу няма. Міжнародны пераход «Мольдзевічы» знаходзіцца ў пяці кіламетрах ад станцыі. Гэта першае, другая няззручнасць у тым, што ад гэтага міжнароднага пераходу дарогі да Крукоў і навакольных вёсак няма. Кіруйцеся, дарагія госцейкі, па цаліку. Вось і просяць жыхары вёсак двух сельсаветаў дазволіць пераход праз «Крукі» з візамі. Просьба, на мой погляд, зусім натуральная. Калі чалавеку можна прайсці праз міжнародны пераход, дакументы ў яго ў парадку, чаму гэта не дазваляецца зрабіць там, дзе працэдура спрошчаная? Пакутуюць зноў жа тыя, хто бядней. Уладальнік аўтамабіля не мае праблем: для яго лішні дзесятак-другі кіламетраў — не перашкода. А той, хто пехам?

І нельга думаць, што праблема існуе для абмежаванай колькасці гасцей з Прыбалтыкі. Гэтыя мясціны ў свой час далі суседнім рэспублікам, Калінінградскай вобласці нямала рабочай сілы. Людзі аселі там назаўжды. Але ж родныя мясціны, бацькі. Вось і купляюцца, афармляюцца візы, едуць беларусы на радзіму. А тут тузаніна. Я пацікавіўся: у двух вышэйназваных Саветах за год афармляюць дакументы на ўезд больш як дзве тысячы чалавек.

Ды і са спрошчаным пераходам мяжы не ўсё гладка. Жыхары прыгранічча-пенсіянеры маюць права наведваць у выхадныя сваякоў у Літве без асаблівых перашкод. А вось чалавеку непенсіённага ўзросту, ёсць яшчэ на вёсцы і такія, хаця з кожным годам іх менее, даводзіцца няпроста. Для разавага пераходу мяжы ён павінен найперш ехаць у цэнтр Савета, напрыклад, у Камаі. Там выпраўляюць за тры тысячы даведку аб тым, што ён мае ў літоўскім прыгранічны блізкага сваяка. Потым з гэтай даведкай кіравацца аж у Паставы, дзе ў камендатуры, нарэшце, атрымае гэты доўгачаканы разавы пропуск. За адзін дзень не ўправіцца ніяк. Губляе чалавек аж два працоўныя дні.

Ну а калі тэрмінова спатрэбілася трапіць у Літву будным днём? Не атрымаецца. Расказвалі мне пра сям'ю Ожэляў з Муляроў. У Гадуцішках (Літва) памерла жонка брата. А дзень будны. І на пункце спрошчанага пераходу мяжы беларусаў да сваякоў у суседнюю рэспубліку не пусцілі. Дарэчы, літоўская завядзёнка значна мякчэйшая.

Канечне ж, Ожэлі трапілі на хаўтуры. Пры адсутнасці сапраўднай мяжы існуе шмат «партызанскіх» сцежак. Яны не пусцеюць яшчэ і таму, што навакольныя вёскі здавён адносіліся да Гадуценскага касцёла. І католікі з устанаўленнем мяжы не думаюць мяняць сваёй парафіі.

Ведаю, што па гэтаму пытанню рыхтуе запыт дэпутат Вярхоўнага Савета рэспублікі па Пастаўскай акрузе Пётр Розынка, адназначна выступаюць за вырашэнне праблемы самі пагранічнікі, мытнікі. Ды змяніць статус пагранічнага пераходу можна толькі на дзяржаўным узроўні.

Алесь КАСЦЕНЬ.

ПРАВЕРЦЕ ПРАВІЛЬНАСЦЬ АФАРМЛЕННЯ АБАНЕМЕНТА

На абанеменце павінен быць пастаўлены адбітак касавай машыны.

Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанеменце прастаўляецца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету або часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай карткай запаўняецца падпісчыкам чарнілам, разборліва, без скарачэнняў, адпаведна ўмовам, выкладзеным у каталогах.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі «ПВ-МЕСЦА» робіцца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ
у камерцыйных банках на 21 лютага 1996 г.

Назва банка	Долар ЗША Купля	Долар ЗША Продаж	Нямецкая марка Купля	Нямецкая марка Продаж	Расійскі рубель Купля	Расійскі рубель Продаж	Тэлефоны
Белбізнесбанк (гал. аперац. упраў.)	11900	12100	7900	8150	2.30	2.50	067
Белбізнесбанк (гарадская дырэкцыя)	11850	12150	7900	8250	2.30	2.55	
Белзнешэканомбанк							267-022
ФК «Вераніка»*** (за расійскія рублі)	11950 4800	12050 4900	8020	8200	2.46	2.52	531-504
Мінскі транзітны банк***	11800	12200	7800	8100	2.35	2.55	298-174
Ф-л 0104 АКБ «Минский транзитный банк»	11900	12100	7850	8050	2.00	2.50	372-825
Народны банк	11900	12100	7800	8150	2.38	2.50	238-610
«Алімп»	11900	12100	7950	8200	2.45	2.54	508-556
Ф-л № 1 АКБ «Алімп»	11950	12150	7800	8100	2.35	2.48	291-646, 067
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	11500		7905.41		2.40		
Цэнтрабанк Расіі	4770		3278.35		100 бел.р. 39.27		

Магчыма аперацыя за наяўны і безнаяўны разлік

** — Аперацыя праводзіцца толькі па безнаяўнаму разліку

*** — Аперацыя з валютай звыш 1000 $ праводзіцца на дагаворных умовах

На працягу дня ўстаноўленыя курсы могуць мяняцца, курсы галаўнога ўпраўлення банка могуць неістотна адрозніваецца ад курсаў, устаноўленых у абменных пунктах.

Інфармацыя атрымана ад галаўных упраўленняў негандлёвых аперацый адпаведных банкаў.

Агенцтва Граўцова.

«У ГАНОВЕРЫ МЫ ПАВІННЫ ПАКАЗАЦЬ МАГЧЫМАСЦІ БЕЛАРУСІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

экaноміцы рэспублікі, інвестыцыйных праектах, нацыянальнай заканадаўча-нарматыўнай базе для знешнеэканамічнай дзейнасці, банкаўскай сістэме, сістэме раздзяржаўлення і прыватызацыі і г. д. Там жа будзе размяшчацца даведачна-кансультацыйна-інфармацыйная група з ліку спецыялістаў Мінэканомікі, Мінзнешэканомсувязей, Нацыянальнага банка, Мінфіна, Міндзяржмаёмасці, БелГПП. На гэтым жа стэндзе будзе інфармацыйны тэматычны раздзел, што прысвечаны дзесяцігоддзю работы па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС і ўзнімае праблемы, вырашэнне якіх патрабуе садзейнічання міжнароднай грамадскасці. Плануецца арганізаваць прэс-канферэнцыю, семінар і іншыя мерапрыемствы, закліканыя яшчэ раз прыцягнуць увагу сусветнай грамадскасці да тэмы Чарнобыля.

— А якая праграма Дня беларуска-германскай эканомікі на маючым адбыцца кірмашы?

— Цяпер праграма Дзён знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі, але ўжо можна сказаць, што асноўная яе мэта — прадаставіць знешняму свету як мага больш інфармацыі аб усіх баках жыцця нашай рэспублікі: яе гісторыі, эканоміцы, культуры, навуцы.

Не сакрэт, што пра Беларусь на Захадзе ведаюць вельмі мала. Акрамя таго, супярэчлівая інфармацыя аб нашай рэспубліцы, што зрэдку пранікае ў заходнія сродкі масавай інфармацыі, не заўсёды аб'ектыўна адлюстроўвае сітуацыю ў краіне. Таму living рознабаковыя звесткі пра Беларусь з вуснаў яе кіраўнікоў, спецыялістаў розных міністэрстваў, арганізацый, дырэктараў прадпрыемстваў, навуковых устаноў на спецыяльна арганізуемай канферэнцыі змогуць запоўніць існуючы вакуум. Значнае месца на канферэнцыі зойме абмеркаванне пытанняў супрацоўніцтва Беларусі і Германіі. Мы плануем прывезці ў Гановер літаратуру на нямецкай мове, якая датычыць розных аспектаў жыцця рэспублікі. Рыхтуецца таксама і невялікая культурная праграма.

— Думаецца, Міхаіл Уладзіміравіч, дарэчы задаць і такое пытанне: якія праблемы будуць абмяркоўвацца на чацвёртым пасяджэнні германа-беларускага эканамічнага савета?

— Пытанняў, якія патрабуюць абмеркавання і двухбаковых кансультацый, вельмі шмат. Іх цяжка пералічыць, таму назаву толькі некаторыя: кааперацыя ў галіне хімічнай, фармацэўтычнай, электроннай прамысловасці, у прыборабудаванні і вытворчасці хімічнага абсталявання, праекты ў сферы будаўніцтва і вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, сумесная работа па стварэнню нацыянальнай заканадаўчай базы ў галіне страхавання, супрацоўніцтва ў сферы машына- і аўтамабілебудавання, сумесныя праекты ў галіне сельскай гаспадаркі і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, нарэшце, пытанні ўдасканалення банкаўскай фінансавай сістэмы нашай рэспублікі.

— Такім чынам, асноўная мэта арганізацыі комплексу мерапрыемстваў па прэзентацыі Рэспублікі Беларусь на веснавым Гановерскім кірмашы заключаецца ў паказе яе сапраўдных і патэнцыяльных магчымасцей у справе інтэграцыі ў сусветную эканамічную прастору?

— Вы маеце рацыю. Мы спадзяёмся, што нягледзячы на ўсе складанасці падрыхтоўкі грандыёзнага мерапрыемства, яно пройдзе паспяхова. А вынікам яго стане атрыманне нашай рэспублікай рэальнай магчымасці змяніць у лепшы бок свой палітычны і эканамічны імідж.

Віктар САХАНКОЎ, БЕЛТА.

Аб паводках папярэджвае Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

Як паведамілі БЕЛТА ў Камітэце па гідраметэаралогіі, вышыня снежнага покрыва на тэрыторыі рэспублікі складае ў сярэднім 20—40 см, з запасамі вады ў ім 35—75 мм. Снегазапасы размяркоўваюцца нераўнамерна: найбольшыя з вышынёй 35—40 см і з запасамі вады да 50—70 мм, у паўночна-заходняй частцы, у басейнах Нёмана, Віліі, Прыпяці, Пцічы, Свіслачы, верхнім цячэнні Бярэзіны. Найменшыя — ва ўсходняй частцы Гомельскай і Магілёўскай абласцей, а таксама па крайняму захаду Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, дзе вышыня снегу ўсяго 5—15 см, а запасы вады — 10—20 мм.

Таўшчыня лёду на рэках і вадаёмах Беларусі на 10—15 см больш чым звычайна ў гэты перыяд — ад 25 да 50 см, а на асобных участках Дняпра, Бярэзіны і Прыпяці адзначаецца ледастаў з таросамі таўшчынёй да 75 см.

З улікам такой абстаноўкі паводкі чакаюцца на ўсёй тэрыторыі рэспублікі. Паводле прагнозаў сіноптыкаў, вышэй нормы вясення паводка будзе на Прыпяці, Нёмане, Віліі і ў верхнім цячэнні Бярэзіны. Магчыма падтапленне сельгасугоддзяў і населеных пунктаў у шэрагу раёнаў Мінскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей. Да найбольш неспрыяльных спецыялісты далучаюць Пінскі, Лунінецкі, Столінскі раёны Брэсцкай, Жыткавіцкі, Лельчыцкі, Калінкавіцкі, Мазырскі раёны Гомельскай абласцей, дзе высокія паводкі назіраюцца адзін раз у тры гады і апошняя была ў 1993 годзе.

Прагноз дапаўняе намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях, старшыня Камітэта па гідраметэаралогіі Юрый ПАКУМЕЙКА:

— Матэрыялы аб перадпаводкавай сітуацыі накіраваны ў Міністэрства абароны, МУС, Мінсельгасхарч, жыллёва-камунальную гаспадарку, а таксама ўсім старшыням абл-райвыканкомаў для прыняцця мераў па прадухіленню негатыўных вынікаў веснавых паводак. Да наступлення паводкі, якая чакаецца ў канцы сакавіка—пачатку красавіка, мы раім вывезці з зон затаплення тэхніку і сельскагаспадарчы інвентар, хімічныя ўгнаенні і сродкі аховы раслін, сена, сельгаспрадукцыю. Кіраўнікі рэгіёнаў абавязаны забяспечыць падрыхтоўку транспартных і матэрыяльна-тэхнічных рэзерваў, каб у выпадку неабходнасці эвакуіраваць з зон бедстваў насельніцтва, хатнюю жывёлу і г. д.

Затапленні прагназіруюцца не толькі ў поймах рэк, але і ў нізінных мясцовасцях. Мы нагадваем кіраўнікам аб неабходнасці загадзя паклапаціцца наконт адводу вады. У гэтай сувязі адпаведныя распараджэнні накіраваны ўсім гарадскім і раённым камунальным службам, у тым ліку і ў сталічную гарадскую гаспадарку.

Таўшчыня лёду на рэках Беларусі прымушае патурбавацца аб бяспецы гідратэхнічных збудаванняў і прадухіленні магчымых катастроф на іх. У бліжэйшы час пройдзе праверка гатоўнасці да выпрабаванняў спецыяльных падраздзяленняў міністэрстваў абароны і ўнутраных спраў рэспублікі.

Праблемы, якія датычаць веснавых паводак, стануць прадметам абмеркавання на нарадзе спецыялістаў і калегіі міністэрства, якія пройдуць у лютым-сакавіку.

Усе кропкі над «і» Міністэрства па надзвычайных сітуацыях канчаткова расставіць на пасяджэнні рэспубліканскай камісіі па надзвычайных сітуацыях і дасць прамыя ўказанні міністэрствам і ведамствам, абласным выканаўчым камітэтам і надзвычайным камісіям на месцах для прадухілення магчымых вынікаў прыроднай стыхіі.

РЭПАРЦЁР АТРЫМАЎ ЗАДАННЕ...

ПАДЛІЧЫЦЬ ТРАФЕІ ПАСЛЯ ПАЛЯВАННЯ

Літаральна днямі ў лясах Беларусі прагрымелі апошнія стрэлы, якія паставілі кропку ў бягучым асенне-зімовым сезоне палявання. Пакінуўшы на сумленні саміх паляўнічых падлік памераў і колькасці здабытай імі дзічыны, карэспандэнт «Звязды» ўзяўся вызначаць іншыя лічбы: матэрыяль[illegible]

[illegible] ват бывалы паляўнічы. А каштуюць яны ад 5500 да 6000 рублёў (са шротам), або ад 12 да 27 тысяч рублёў (з куляй) за адзін. Патранташ абыдзецца ў 247—340 тысяч рублёў, прыцэл — 812.000 — 850.000. За кілаграм шроту ў залежнасці ад нумару трэба будзе заплаціць [illegible]

[illegible]

Зразумела, без патронаў у лес не пойдзеш на [illegible]

Сяргей РАСОЛЬКА.

Уладзімір РАМАНЮК, віцэ-прэзідэнт «Пушэ» па гандлю, прэзідэнт СП «Пушэ-Трэйдынг»:

«СЁННЯ «ПУШЭ» ГАРАНТУЕ СВАІМ ПАКУПНІКАМ УМЕРАНЫЯ ЦЭНЫ І ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ АБСЛУГОЎВАННЯ»

Тэма звычайнага гандлёвага бізнесу даўно ўжо стала асобна сярод многіх іншых відаў [illegible] Адным з першых прадстаўнікоў гэтага накірунку з'яўляецца закрытае акцыянернае таварыства «Пушэ». Аб тым, што ўяўляе сёння сабой гандлёвы бізнес «Пушэ», якую долю ён займае ў агульным аб'ёме фірмы — наша размова з віцэ-прэзідэнтам «Пушэ» па гандлю, прэзідэнтам СП «Пушэ-Трэйдынг» Уладзімірам РАМАНЮКОМ.

— Уладзімір Уладзіміравіч, згадзіцеся, што сёння людзі ведаюць «Пушэ» як фірму, якая займаецца аўтабізнесам, прадаючы на рынку рэспублікі «Шкоды» і «Жыгулі», а вось пра гандлёвы бізнес — не вельмі.

— Магчыма, што зусім зразумела. Аўтабізнес у дзейнасці «Пушэ» займае львіную долю. Але і рознічны гандаль, рэстаранны бізнес у нас апошнім часам таксама набраў абароты.

— Вы маглі б назваць асноўныя напрамкі гандлёвага бізнесу «Пушэ»?

— Канешне. Гэта продаж электронна-бытавой тэхнікі і прадуктаў харчавання. Да таго ж, мы маем некалькі дапаможных галін — продаж мэблі, прадметаў асабістай гігіены, парфумы.

Ведаеце, у супермаркеце «Пушэ» можна купіць вельмі многа чаго. І пры гэтым нашы супрацоўнікі гарантуюць сваім пакупнікам умераныя цэны і высокую якасць абслугоўвання.

— Якую долю займае гандлёвы сервіс у агульным абароце «Пушэ»?

— Я ўжо сказаў, што зараз мы развіваемся бурнымі тэмпамі. А доля наша пакуль не вельмі значная. Разам з нашым аграбізнесам — прадукцыяй СП «Пушэ-Агро» ў выглядзе свежых каўбас, мясапрадуктаў, мы займаем дзесьці 20 працэнтаў. Пасля таго, як паўтара года таму гасцінна расчыніў свае дзверы гандлёвы дом «Пушэ» (тады, можна сказаць, рознічны гандаль у шырокім сэнсе гэтага слова пачаў свой адлік у «Пушэ»), мы кожныя два-тры месяцы адкрываем новыя магазіны літаральна ва ўсіх буйных гарадах Беларусі.

— Асобна ў гэтым плане стаіць сталіца.

— Так, што зусім апраўдана, таму што асноўная колькасць пакупнікоў, думаю, прыпадае на Мінск. Да таго ж, пакупнік, лічу, заўсёды застаецца задаволеным пасля наведвання гандлёвых плошчаў у любым месцы, дзе працуе «Пушэ». Ці гэта магазін па продажы электронікі ад «Філіпса», ці павільён святлотэхнічных вырабаў «Філіпс».

— Уладзімір Уладзіміравіч, на ваш погляд, просты пакупнік, заходзячы ў магазін «Пушэ» і не паглядзеўшы на шыльду, здольны зразумець, куды ён трапіў?

— Не сумняваюся, бо пры адкрыцці любой гандлёвай кропкі мы прытрымліваемся строгіх правілаў: аднолькавае сучаснае абсталяванне, дызайн, святло, форма прадаўцоў і яшчэ шэраг розных нюансаў. Так што калі вы выпадкова трапіце да [illegible] купляюць прадукты харчавання. А ў нас яны ў шырокім асартыменце, і нядорага, і кожны дзень свежыя.

Калі мы вытрымаем высокі тэмп развіцця, то ўжо да канца 1996 года будзем мець яшчэ дзесятак прадуктовых магазінаў, ну і столькі ж па продажы электронікі.

— Уладзімір Уладзіміравіч, мы неяк зусім упусцілі рэстаранны бізнес. Як-ніяк, а напярэдадні Новага года расчыніў свае дзверы рэстаран «Феліцыя».

— Наогул, рэстаранны бізнес мы не выдзяляем у асобны накірунак. Гэта спадарожны бізнес, які дапамагае нам у развіцці асноўных відаў бізнесу. На балансе «Пушэ» знаходзіцца яшчэ каля дзесятка бараў: пры магазінах, станцыях тэхабслугоўвання, офісах. Мяркую, што гэта вельмі зручна для пакупнікоў.

— У нашай размове часта ўпамінаецца слова «цэны». Не будзем удавацца ў падрабязнасці, што і колькі каштуе, хоць гэта вельмі хвалюе людзей. І ўсё ж, ці не спужаюць яны патэнцыяльных пакупнікоў? Напрыклад, перад святам. Якраз заўтра мужчынскае свята — 23 лютага, а праз два тыдні — 8 Сакавіка.

— Магу запэўніць, што ў параўнанні з іншымі дзяржаўнымі і камерцыйнымі магазінамі ў нас тавары значна таннейшыя. І яшчэ перад святамі «Пушэ» робіць 15—20-працэнтную скідку на абсалютную большасць тавараў. Хочаце ў гэтым упэўніцца — загляніце ў магазіны «Пушэ».

Гутарыў Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

У СВЕЦЕ

ПЕЛЕНГ-НАВІНЫ

● ГРАЧОЎ НЕ НАЗВАЎ АГУЛЬНАЙ ЛІЧБЫ СТРАТ РАСІЙСКАГА БОКУ

У ходзе вайсковай аперацыі ў пасёлку Навагрозненскім, на ўсходзе Чачні, федэральнымі сіламі знішчана больш як 200 дудаеўскіх баевікоў. Пра гэта паведаміў міністр абароны Расіі Павел Грачоў. Аперацыя завершана, і яе вынікі можна расцэньваць як паспяховыя, адзначыў Грачоў. Па яго словах, страты сярод вайскоўцаў Узброеных Сіл склалі чацвёра забітых і 19 параненых. Разам з тым міністр прызнаў, што больш істотныя страты панеслі ўнутраныя войскі МУС, аднак Грачоў не назваў іх колькасці. Па словах міністра, 21-22 лютага ўнутраныя войскі і міліцыя правядуць дадатковую праверку жылых дамоў і падвалаў Навагрозненскага з мэтай выяўлення баевікоў.

● У МАСКВУ ПРЫБЫЎ ДЫРЭКТАР МВФ

Учора ў Маскву прыбыў дырэктар-распарадчык Міжнароднага валютнага фонду Мішэль Камдэсю. Ён правядзе перамовы з расійскім кіраўніцтвам аб прадастаўленні Расіі трохгадовага пашыранага крэдыту. У ходзе візіту, які працягнецца пяць дзён, Камдэсю сустрэнецца з прэзідэнтам Ельцыным і прэм'ер-міністрам Чарнамырдзіным. Згодна з пажаданнем дырэктара-распарадчыка МВФ, будзе арганізавана яго сустрэча з рэдактарамі цэнтральных расійскіх сродкаў масавай інфармацыі.

● МІНІСТР НЕ ПАДТРЫМАЎ КРЫВАВАЙ ПАЛІТЫКІ ЎРАДА

Міністр замежных спраў ва ўрадзе Дудаева Юсэф падаў у адстаўку ў знак пратэсту супраць намеру чачэнскіх палявых камандзіраў арганізаваць тэракты ў заходніх краінах. У інтэрв'ю радыё «Свабода» з аднаго з турэцкіх гарадоў Юсэф заявіў, што не можа падтрымаць такія дзеянні. На яго думку, да пагрозы тэрактаў трэба аднесціся сур'ёзна.

● У ЗША З'ЯВІЎСЯ НОВЫ «СЯБАР І САЮЗНІК»

Прадстаўнік дзярждэпартамента ЗША Нікалас Бернс назваў Украіну сябрам і саюзнікам Злучаных Штатаў. Па словах Бернса, адной з тэм перамоў дзяржсакратара ЗША Крыстафера з прэзідэнтам Украіны Кучмам, што пачаліся ўчора, будзе апублікаваная ў панядзелак газетай «Лос-Анжэлес Таймс» інфармацыя аб тым, што Украіна прадае і здае ў арэнду ваенныя самалёты калумбійскім гандлярам наркотыкамі.

● ДЫСІДЭНТАМ АБ'ЯДНАЦЦА НЕ ЎДАЛОСЯ

На Кубе напярэдадні запланаванай сустрэчы дысідэнтаў затрыманы дзесяткі нездаволеных рэжымам. Паводле даных з апазіцыйных колаў, у панядзелак пад арыштам знаходзілася 20 чалавек, у тым ліку 3 журналісты. Урад у Гаване забараніў сустрэчу 130 дысідэнцкіх груп, якая павінна была праходзіць 24—27 лютага. Разрозненыя маленькія групы на гэтай сустрэчы хацелі аб'яднацца ў агульную арганізацыю.

● ВЫРАТАВАННЕ ТАПЕЛЬЦАЎ — СПРАВА РУК САМІХ ТАПЕЛЬЦАЎ

Швецкі турыст, які выжыў у катастрофе філіпінскага парома, што адбылася ў нядзелю, абвінаваціў яго каманду ў тым, што маракі не ратавалі пасажыраў, а ратаваліся самі, у той час як мінімум 70 чалавек, сярод якіх было шмат дзяцей, патанулі. Усе дванаццаць членаў экіпажа выжылі. Згодна з данымі філіпінскай паліцыі, на пароме падчас катастрофы знаходзілася каля трохсот чалавек, замест дазволеных для правозу ста. У спісах пасажыраў іх увогуле значылася ўсяго 59.

● ТЭЛЕФОН-ЗАБОЙЦА

Аўтамабільныя аварыі на дарогах Кувейта займаюць першае месца сярод прычын смяротнасці ў краіне. Добра абсталяваныя скорасныя трасы спрыяюць хуткай яздзе, а яе ахвярамі ў чатырох выпадках з пяці робяцца толькі што атрымаўшыя правы маладыя людзі ва ўзросце да 25 гадоў. Цікава, што галоўнай прычынай катастроф з'яўляецца не алкаголь, бо яго ўжыванне ў Кувейце забаронена. Сапраўдная прычына здарэнняў — мабільны тэлефон. Тэлефонныя суразмоўцы вадзіцеляў пры гэтым часта першымі даведваюцца аб трагедыі сваіх сяброў і не па сваёй волі робяцца іх ускоснымі віноўнікамі.

● МЭТА АПРАЎДВАЕ СРОДКІ?

Галоўнага рэдактара буйнейшай штодзённай ізраільскай газеты «Едыот ахранот» прызналі вінаватым у незаконным падслухоўванні тэлефонаў свайго саперніка, выдаўца і рэдактара газеты «Маарыў». Як паведаміў прадстаўнік судовых органаў, рэдактар «Едыот ахранот» Машэ Вардзі заплаціў 100 тысяч долараў прыватнаму дэтэктыўнаму агенцтву за падслухоўванне тэлефонаў Офера Німродзі, уладальніка і рэдактара газеты «Маарыў». Абедзве газеты займаюць дамінуючае становішча на ізраільскім газетным рынку і вядуць упартую барацьбу за павелічэнне колькасці сваіх чытачоў. «Маарыў» пераняла фармат і стыль «Едыот ахранот», спадзеючыся узняць свой штодзённы тыраж са 160 тысяч экземпляраў да 400 тысяч свайго больш удачлівага саперніка.

Радыё «Свабода», «Голас Амерыкі», «Радыё Расіі» і «Радыё-РОКС» слухаў Сяргей ПРОТАС.

ПІСЬМЕННІКІ ВЫРАШЫЛІ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ АДЗІН АДНАГО

У Доме творчасці пісьменнікаў «Іслач» адбылося пасяджэнне міжнароднага літаратурнага фонду, у які ўваходзяць амаль што ўсе былыя рэспубліканскія фонды.

У апошні час вырашылі далучыцца да гэтай грамадскай арганізацыі пісьменнікі Латвіі. На пасяджэнні міжнароднага фонду прысутнічаў пасол Латвіі ў Расіі Яніс Пэтэрс, паэт, былы старшыня Саюза пісьменнікаў Латвіі. У Латвіі, дарэчы, як і ў іншых былых савецкіх рэспубліках, у творчых людзей, пісьменнікаў аднолькавыя праблемы.

Сабраўшыся на сустрэчу, пісьменнікі вырашылі, што ім трэба падтрымліваць адзін аднаго, займацца творчымі справамі, а не палітыкай.

НЕ ЗУСІМ ЗВЫЧАЙНЫЯ ФУНКЦЫІ ВЫКОНВАЮЦЬ КАЦЕЛЬНІ ГРОДНА

Апошнім часам прадпрыемствам ацяпляльных кацельняў і цеплавых сетак Гродна, якія працуюць на цвёрдым паліве, нярэдка даводзіцца выконваць не зусім звычайныя функцыі: тут спальваюць... разліковыя білеты Нацбанка Рэспублікі Беларусь, непрыдатныя для далейшага абарачэння.

А нядаўна ў попел ператварыліся каля 2 тон каўбасы «салямі», якую нельга было ні скарміць жывёле, ні закапаць па прычыне яе «якасці». Назва фірмы, якой належаў гэты непрыдатны для ўжывання далікатэс, на жаль, засталася ў сакрэце.

Ася КУНІЦКАЯ, БелаПАН.

У БЕЛАВЕЖЫ ЛОВЯЦЬ АЛЕНЯЎ

У Белавежскай пушчы завяршаецца адлоў аленяў для рассялення іх у іншыя лясныя гаспадаркі Беларусі.

Па словах спецыялістаў, на сённяшні дзень выкананы заказы Целяханскага доследнага лясгаса і Прыпяцкага запаведніка. Для іх у Белавежы ўжо адлоўлена 70 аленяў. На чарзе — перасяленне гэтых грацыёзных жывёл і ў адзін з лясгасаў Віцебскай вобласці.

Дарэчы, такія мерапрыемствы праводзяцца ў пушчы нячаста. Па-першае, таму, што адлоў можна праводзіць толькі ў зімовы час. Другая прычына — кожны алень каштуе гаспадаркам (гэта не тычыцца заказнікаў і запаведнікаў) немалых грошай.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЫРАТАВАЛІ ЛІТОЎСКІ ЦЯГНІК

Пры падыходзе да станцыі Лынтупы літоўскага прыгараднага дызель-цягніка «Вільнюс—Дзіджасаліс», маршрут якога пралягае таксама і па беларускай тэрыторыі, у ім загарэўся галоўны маторны вагон.

Беларускія чыгуначнікі адразу выклікалі мясцовую пажарную каманду і пачалі ўласнымі сіламі змагацца з полымем. У выніку з дапамогай падаспеўшых пажарных агонь удалося патушыць, пакуль ён не перакінуўся на астатнія вагоны.

Праз нейкі час цягнік адправіўся па свайму маршруту. Аб гэтым здарэнні паведаміла раённая газета «Пастаўскі край».

Уладзімір ШЫК.

ЗНОЙДЗЕНА ПАРТЫЯ ФАЛЬШЫВЫХ 50-ТЫСЯЧНЫХ РАСІЙСКІХ КУПЮР

Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю УУС Мінгарвыканкома заняты цяпер расследаваннем дзеянняў інтэрнацыянальнай групы фальшываманетчыкаў, якія збывалі падробленыя 50-тысячныя купюры Банка РФ.

На след злачынцаў выйшлі ў пачатку лютага, калі ў Вілейскі ГРАУС паступіў сігнал аб падазронай жанчыне, якая прапаноўвала камерсантам на мясцовым калгасным рынку фальшыўкі. У гэты ж дзень яна была затрымана, а пры ёй выявілі 28 падробленых купюр, яшчэ 6 «паперак» знайшлі ў падманутых зламысніцай людзей.

Наступны вобыск па месцы яе жыхарства ў адным з райцэнтраў Мінскай вобласці прынёс яшчэ 256 несапраўдных купюр. Акрамя таго, там арыштавалі і двух саўдзельнікаў прадпрымальнай маладой асобы. Следства ўжо ўстанавіла, што гэта група рэалізоўвала свой тавар, атрыманы з-за мяжы, таксама ў Асіповічах, Бабруйску, Слуцку, Старых Дарогах, Мінску, Мар'інай Горцы і Санкт-Пецярбургу.

Фальшывыя расійскія купюры вартасцю 50 тысяч рублёў выпускаліся капельна-струйным метадам на ЭВМ на паперы нядрэннай якасці. Праўда, копіі ўсё роўна маюць шэраг заган: бляклы агульны фон малюнка, чырвоныя валокны на неафарбаваных месцах і, галоўнае, вытворцы, асабліва не мудруючы, рабілі па некалькі адбіткаў з сапраўдных купюр.

Таму атрымліваліся фальшыўкі з абсалютна аднолькавымі серыямі і нумарамі. Хацелася б папярэдзіць грамадзян, якія маюць на руках 50-тысячныя купюры з серыямі «КК», «БЛ» і «ВГ», — магчыма, гэта падробкі. На сённяшні дзень канфіскаваны пакуль 324 такія купюры на суму больш як 16 млн. рублёў.

Сяргей ХРЫПАЧ, прэс-цэнтр МУС.

УСМЕШКА МАСТАКА

Малюнак Леаніда РАЗЛАДАВА.

ХВАЛЯ «НОВЫХ» ДОЛАРАЎ ХУТКА ПРЫКОЦІЦЦА І ДА НАС

Па некаторых звестках, стодоларавыя банкноты новага ўзору пачнуць сваё хаджэнне ў ЗША ўжо ў пачатку сакавіка бягучага года. Можна меркаваць, што ўжо ў красавіку-маі вышэйпамянёныя купюры з'явяцца і ў Беларусі.

Трэба заўважыць, што традыцыйна пры з'яўленні новай купюры ў грамадзян да яе з'яўляецца проста нездаровая цікаўнасць. Калі ў Расіі Цэнтрабанк дазволіў камерцыйным банкам патрабаваць з фізічных асоб за абмен «старых» долараў на «новыя» камісійныя, якія не перавышаюць двух працэнтаў ад сумы аперацыі, дык у нашай краіне справы зусім іншыя.

Так, згодна з 601-м палажэннем Нацбанк РБ строга абмяжоўвае кола аперацый, за якія камбанкі маюць права браць у насельніцтва плату (у спісе гэтых аперацый абмен старых купюр на новыя адсутнічае). Да таго ж прэс-цэнтр Нацбанка неаднаразова ўказваў банкам і грамадзянам праз сродкі масавай інфармацыі, што спагнанне камісійных за гэты від паслугі рабіцца не будзе. Але некаторыя банкі спрытна спрабуюць выкарыстаць доларавую «ліхаманку» ў сваіх інтарэсах. Напрыклад, філіял Беларускага біржавога банка «Мінскі гарадскі банк» прапануе сваім кліентам новую паслугу — валютны ўклад «Гарантыя». Спецыяльна для тых, каму старыя стодоларавыя паперкі прама пякуць рукі, філіял прапануе так званы «абменны ўклад», па якім пасля заканчэння тэрміну (9—12 месяцаў) можна атрымаць свае грошы і працэнты ўжо ў банкнотах USD новага ўзору. Аднак улічваючы такую паслугу, банк прапануе не 32 працэнты, як па звычайных валютных укладах, а толькі 26 працэнтаў гадавых як па «суперзручных».

Чытачам «Звязды» ў гэтым разе нялішне будзе напомніць, што па заяве Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША хаджэнне старых стодоларавых купюр будзе адбывацца нароўні з новымі, а лепшы спосаб не страціць грошы на абмене — не панікаваць.

Сяргей КУРКАЧ.

А МАГЛО Б БЫЦЬ І ГОРШ

Калі на станцыю Жлобін са станцыі Калінкавічы позна ноччу прыбыў грузавы састаў, укамплектаваны налiўнымі цыстэрнамі, адзін з работнікаў чыгункі заўважыў, што з ніжняга зліўнога крана адной цыстэрны цячэ.

І што б вы думалі? Бензін маркі А-76. Аказваецца, у дарозе яго выбегла ажно 51 тона, больш чым на 100 мільёнаў рублёў. А калі падлічыць урон, нанесены прыродзе? Страты, вядома, вялікія. І, тым не менш, магло б быць і горш, калі б, барані Божа, ды якая іскрынка. Зараз шукаюць віноўніка гэтага надзвычайнага здарэння.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

НАС НАВЕДАЛА МІСІЯ МВФ...

Нядаўна рэспубліку наведала місія Міжнароднага валютнага фонду, якая азнаёмілася з выкананнем узятых рэспублікай абавязацельстваў у рамках праграмы «стэнд-бай» — з адпаведным крэдытаваннем з боку МВФ. Адпаведна ж, мэтай гэтага азнаямлення было выяўленне магчымасці далейшага крэдытавання. Місія пакінула пасля сябе памятную запіску з выкладзеным у ёй бачаннем эканамічных пераўтварэнняў у рэспубліцы і, у прыватнасці, цяперашняй сітуацыі, умовамі далейшага супрацоўніцтва.

У запісцы адзначана, што хоць асобныя паказчыкі праграмы дасягнуты, прагрэс у галіне структурных пераўтварэнняў быў абмежаваны, большасць структурных кантрольных паказчыкаў не выканана, у некаторых асноўных галінах важныя меры былі скіраваны назад з вяртаннем да празмернага адміністрацыйнага і дзяржаўнага кантролю. У выніку, згодна з меркаваннем місіі, дасягнутая ўмераная стабілізацыя знаходзіцца пад пагрозай. Пры такіх абставінах, робіцца заключэнне, на дадзеным этапе далейшае выдзяленне сродкаў па існуючай праграме «стэнд-бай» немагчыма. Разам з тым місія лічыць, што энергічнае выкананне неабходных паслядоўных мераў магло б прывесці ў далейшым да прагрэсу ў выкарыстанні рэсурсаў МВФ.

Што канкрэтна выклікала нездаволенасць місіі і, што, адпаведна, трэба зрабіць?

У прыватнасці, місія ўказвае на значную страту валютных рэзерваў, яна незадаволена ўвядзеннем абмежаванняў па валютных аперацыях і нашым цяперашнім валютным калідорам, пры гэтым прапануе захаваць яго да сярэдзіны сакавіка, адначасова даўшы магчымасць курсу адносна хутка дасягнуць верхняй мяжы, прадугледжвае ў далейшым магчымасць змянення яго межаў. На погляд місіі, адміністрацыйны кантроль і абмежаванні па валютных аперацыях павінны быць ліквідаваны да канца красавіка, грашова-крэдытную палітыку належыць зрабіць больш жорсткай, скіраванай на далейшае зніжэнне інфляцыі да 1-2 працэнтаў у месяц да сярэдзіны года. Нацыянальнаму банку рэкамендуецца забяспечыць рэальныя працэнтныя стаўкі на ўзроўні не ніжэй, чым у Расіі (там яны амаль у два разы вышэйшыя), яму належыць даваць усе крэдыты (за выключэннем крэдытаў ураду) праз аўкцыёны. Як указваецца ў запісцы, місія занепакоена пагаршэннем сітуацыі ў банкаўскай сферы, яна з насцярожанасцю ставіцца да зліцця банкаў, пераводу дэпазітаў дзяржавы ў адзін банк, да крэдытаў на выплату заработнай платы. На яе думку, за апошнія месяцы НБ практычна страціў незалежнасць у выкананні сваіх асноўных функцый.

Місія таксама зазначае наконт залішняй аптымістычнасці ацэнкі даходаў і фінансавання сёлетняга бюджэту, падкрэслівае, што мяркуемы дэфіцыт будзе цяжка прафінансаваць без росту інфляцыі. Для большай рэалістычнасці прагнозу даходаў яна рэкамендуе далейшае скарачэнне льгот (і адмену адвольных) для суб'ектаў гаспадарання, а таксама прывядзенне да канца лютага экспартна-імпартных пошлін у адпаведнасць з новымі стаўкамі, дзеючымі цяпер у Расіі (г. зн. прапануецца большая лібералізацыя знешнегандлёвых аперацый). Місія ўказвае на закладзены ў бюджэце хуткі рост заработнай платы, які, на яе думку, не пацвярджаецца ростам прадукцыйнасці працы, яна настойвае на далейшым скарачэнні бюджэтных субсідый на розныя датацыі, пакрыццё розніцы ў цэнах і г. д. (у прыватнасці, рэкамендуецца аплату насельніцтвам сабекошту жыллёва-камунальных паслуг давесці да ліпеня з існуючых 76 працэнтаў да 100. Але вось дзе насельніцтву ўзяць?). Фонд падтрымкі сельгасвытворцаў (1-працэнтны падатак з абароту прадпрыемстваў) належыць скасаваць; забяспечыць вяртанне ў бюджэт 2 трыльёнаў рублёў, якія выдадзены ў форме валютных і рублёвых крэдытаў Міністэрству сельскай гаспадаркі і дзяржаўным прадпрыемствам; забараніць выдачу крэдытаў прадпрыемствам, якія не вяртаюць своечасова сродкі ў бюджэт; увесці мараторый на ўрадавыя гарантыі па знешніх пазыках дзяржаўных прадпрыемстваў; ураду прапануецца распрацаваць план скарачэння вялікай запазычанасці па расходах рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама запазычанасці Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Місія выказвае занепакоенасць вялікай запазычанасцю рэспублікі за газ, прапануе ў сувязі з гэтым больш жорстка ставіцца да неплацежаздольных спажыўцоў.

Місія таксама зазначае, што значны прагрэс павінен быць дасягнуты ў трох ключавых напрамках структурных рэформаў. Гэта поўнае і хуткае выкананне праграмы прыватызацыі, дэманапалізацыя ўнутранай сістэмы гандлю, хутчэйшае стварэнне прававой і інстытуцыянальнай структуры эканамічных рэформаў, накіраваных на развіццё сучаснай рыначнай эканомікі (пры гэтым, у прыватнасці, рэкамендуецца хутчэй разгледзець законапраекты аб банкруцтве і прыватнай уласнасці на зямлю).

Тут пералічаны найбольш важныя ўмовы, выстаўленыя місіяй. Як можна меркаваць, яны даволі жорсткія, але, відавочна, цалкам апраўданыя. Гэтыя ўмовы ставяць мэтай эканамічнае закручванне гаек насуперак адміністрацыйнаму, да якога ў нас больш схільныя, яны маюць на мэце найхутчэйшае рэфарміраванне эканомікі і цвёрдую пастаноўку яе на рыначны шлях, а ў канчатковым выніку — спыненне цяперашняга крызісу і збяднення людзей, пачатак пад'ёму эканомікі на зусім новай аснове, свабоднай ад адміністрацыйна-чыноўніцкага дыктату, скіраванай выключна на запатрабаванні спажыўца. Урэшце, падобныя ўмовы і мэты некалі мы ставілі перад сабой самі.

Тым не менш, нягледзячы на жорсткасць патрабаванняў, супрацоўніцтва з МВФ працягваецца, і шлях да яго крэдытаў (наша больш празаічная задача) не закрыты.

Іван АЛЯКСАНДРАЎ.

ПРОЦІСТАЯЦЬ УВОЗУ НЯЯКАСНАЙ ЛІКЁРА-ГАРЭЛАЧНАЙ ПРАДУКЦЫІ

На Гомельскай абласной мытні сталі звычайнымі наступныя эксперыменты: з кожнай партыі лікёра-гарэлачнага імпарту, затрыманай пры спробе правозу па-за мытным пастом, бярэцца на выбар адна з бутэлек, якая праходзіць своеасаблівы тэст на марозаўстойлівасць.

Вынік часта паўтараецца: «40-градусная гарэлка» замярзае. Такім нехітрым спосабам мытнікі ў каторы раз даказваюць гамяльчанам, што шыкоўна аформленая гарэлачная прадукцыя, якая навадніла Гомель, выраблена мясцовымі ўмельцамі-«падпольшчыкамі». На жаль, мала хто ў горадзе ведае, што летась алкагольны сурагат з якасна выкананымі этыкеткамі стаў прычынай смерці 238 чалавек і часовай непрацаздольнасці 447 чалавек.

Ірына ШАНЦАВА, БелаПАН.

ІНФАРМ-КАКТЭЙЛЬ

Два дні цягнуўся судовы працэс у адным з гарадоў штата Тэхас па грамадзянскаму іску мясцовага жыхара супраць кампаніі «Уол-Март», якая валодае сеткай танных супермаркетаў па ўсёй краіне. Ісцец абвінавачваў кампанію ў халатнасці, якая праявілася ў тым, што яна дапусціла знаходжанне ў магазіне грымучай змяі, якая і ўкусіла яго. Пацярпеўшы застаўся жывым, паколькі яму своечасова ўвялі лекі ў бліжэйшай бальніцы. Суд вырашыў справу на карысць істца, якому належыць цяпер атрымаць ад кампаніі 6 тысяч долараў.

Асашыэйтэд Прэс.

Жыхар маленькага французскага гарадка нядрэнна зарабляў на жыццё, час ад часу зрываючы куш у мясцовай зале гульнёвых аўтаматаў. Аднак ён не плаціў падатку са сваіх выйгрышаў. У рэшце рэшт яго адолела падатковая служба, і ён вырашыў вярнуць казне даўгі, якія перавысілі 3,7 мільёна франкаў. Ігрок прыбыў у падатковую ўстанову на чале калоны з трох браніраваных грузавікоў, даверху нагружаных сумкамі з... аднафранкавымі манетамі. Чыноўнікі прынялі груз — 920 сумак агульнай вагой 22 тоны. Менавіта такімі манетамі аўтамат і расплачваецца пры выйгрышы кліента.

Рэйтар.

Італьянская парназорка Эва Хейгер устроіла стрыптыз перад будынкам парламента краіны ў знак пратэсту супраць італьянскай палітычнай сістэмы, якая, на думку некаторых палітыкаў, не апавядае патрабаванням сённяшняга дня. Перад пачаткам спектакля парназорка была ва ўбранні XVIII стагоддзя і ў карнавальнай масцы, каб, як яна сказала, падкрэсліць падабенства паміж карнавальным маскарадам і італьянскімі палітыкамі. Сваё выступленне Эва пачала з таго, што скінула маску.

«Известия».

СЁННЯ

СОНЦА

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.15	17.32	10.17
Віцебск	7.08	17.19	10.11
Магілёў	7.04	17.21	10.17
Гомель	6.59	17.21	10.22
Гродна	7.30	17.47	10.17
Брэст	7.27	17.51	10.24

МЕСЯЦ

Маладзік 19 лютага

ІМЯНІНЫ

Пр. Нікіфара, Інакенція, Генадзія

К. Катэдры св. апостала Пятра, Маргарыты, Марты

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы захаваецца воблачнае надвор'е, часам ападкі, месцамі туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ў Гродне і Брэсце — 0—2 градусы марозу, Мінску і Віцебску — каля нуля, Магілёве — 0—2, Гомелі — 1—3 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак: 23-га — на значнай частцы тэрыторыі, 24-га — месцамі па рэспубліцы пройдзе невялікі снег, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература ўначы — 6—11, пры праясненнях да 16, удзень — 3—8 градусаў марозу.

Медыцынскі прагноз надвор'я на 22 лютага

Надвор'е вызначыцца полем паніжанага атмасфернага ціску. Утрыманне кіслароду ў паветры будзе ніжэй за сярэднія шматгадовыя даныя (пагодная гіпаксія). **22 лютага — неспрыяльны дзень па геафізічных фактарах.** У такіх умовах захоўваецца верагоднасць пагаршэння самаадчування ў метэазалежных хворых з сардэчна-сасудзістай паталогіяй, захворваннямі дыхальнай сістэмы, апорна-рухальнага апарата.

У мэтах прафілактыкі рэкамендуецца пазбягаць фізічных і псіхаэмацыянальных нагрузак, прытрымлівацца дыеты, рэгулярна прымаць лекавыя прэпараты, прызначаныя ўрачом.

Антаніна КАРОЗА, навуковы супрацоўнік БелНДІ кардыялогіі.

Наша жыццё становіцца з кожным днём усё больш складаным. Калі даводзіцца думаць пра хлеб надзённы, пажытак духоўны адыходзіць на апошні план. Праблемы работнікаў культуры, на жаль, застаюцца толькі іх праблемамі. Але да пары да часу...

Безумоўна, большасці мінчан хоць раз у жыцці даводзілася звяртацца да паслуг Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. І, магчыма, усіх іх у той ці іншай меры закранулі праблемы, якімі жыве галоўная бібліятэка краіны, якая існуе з 1922 года. З 1932 года яна перахала ў новы будынак, пабудаваны па праекту архітэктара Г. Лаўрова, у якім знаходзіцца і па сённяшні дзень. Цяпер кніжных фондаў Нацыянальнай бібліятэкі налічваюць больш за 7 мільёнаў экземпляраў. Колькасць чытачоў перавышае ўжо 37 тысяч чалавек.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі: паміж мінулым і будучыняй

Неяк склалася так, што самымі актыўнымі чытачамі бібліятэкі сталі студэнты ВНУ. Па ідэі, Нацыянальная бібліятэка ўзяла на сябе ўсю нагрузку, якую павінны несці на сабе бібліятэкі навучальных устаноў. Але справа ў тым, што пытанне камплектавання іх вучэбнымі дапаможнікамі стаіць сёння пад сумненнем: яно або зусім туды не паступаюць, або маюцца ў недастатковай колькасці. Вось і цягнуцца студэнты менавіта ў «Ленінку», бо лічаць, што дзе-дзе, а там яны абавязкова знойдуць неабходную літаратуру.

Аднак нават Нацыянальная бібліятэка не мае магчымасці забяспечваць усіх падручнікамі, бо ў яе фондах ёсць толькі 2—5 экземпляраў падручнікаў. А калі яшчэ ўлічваць, што праблемы з камплектаваннем не абышлі нават гэтую скарбніцу нацыянальнай культуры...

У гады існавання Савецкага Саюза ў бібліятэчнай сістэме краіны існавала цэнтралізаванае камплектаванне, г. зн. у галоўную рэспубліканскую бібліятэку дасылаўся абавязковы бясплатны экземпляр з Усесаюзнай кніжнай палаты, плюс адзін платны экземпляр абавязкова атрымлівалі з Цэнтральнага калектара навуковых кніг. Такім чынам было гарантавана, што ніводная з выпушчаных новых кніг не міне поля зроку бібліятэкі.

З распадам Саюза ў бібліятэк з'явіліся сур'ёзныя праблемы. На працягу 1991—1994 гг. [illegible] бібліятэка атрымлівала з Расіі адзін бясплатны экземпляр абавязковага кніжнага выдання, але з 1995 года такія паступленні спыніліся. На сённяшні дзень Нацыянальнай бібліятэцы гарантавана паступленне кніг, якія выдаюцца толькі дзяржаўнымі выдавецтвамі Беларусі. У прынцыпе, існуе распараджэнне, якое абавязвае ўсе існуючыя выдавецтвы прадастаўляць адзін бясплатны экземпляр Нацыянальнай бібліятэцы. Але з іх, як кажуць, што з гусі вада. [illegible], да таго ж не існуе ніякіх штрафных санкцый за парушэнне распараджэння.

Зусім сумная карціна назіраецца з паступленнем кніг з Расіі. Работнікам бібліятэкі даводзіцца [illegible] заключаць дамовы з вядучымі расійскімі кніжнымі магазінамі з грошы, выдзеленых дзяржавай. А грашовыя рэсурсы, як вядома, не бясконцыя. Асаблівыя клопаты ўзнікаюць з-за расійскіх перыядычных выданняў, бо не на ўсе патрэбныя часопісы, якія выпускаюцца на тэрыторыі Расіі, можна падпісацца ў іншых краінах СНД.

У 1995 годзе ў Нацыянальнай бібліятэцы ёсць свой валютны рахунак. Валюта неабходна ў першую чаргу для афармлення падпіскі на замежныя выданні (пераважна энцыклапедыі і даведнікі). Так, за выдзеленыя ў 1994 годзе 50 тысяч долараў была афармлена падпіска на 1994—1996 гады. У гэтым годзе валюта на рахунак бібліятэкі [illegible] не паступала.

Кіраўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі звярнулася за фінансавай падтрымкай у некаторыя банкі, але дапамогі адтуль не атрымала.

У гэтай аперацыі сур'ёзную дапамогу аказвае міжнародны кнігаабмен, які ўключае звыш 39 краін і 287 арганізацый (бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў).

Акрамя таго, вялікае значэнне для «Ленінкі» мае кніжная гуманітарная дапамога, якая паступае з Германіі, Англіі, Францыі, у прыватнасці, з боку фонду «Суйбр», Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, інстытута Гётэ, пасольства Францыі.

Так, з 84.712 экземпляраў кніг, якія папоўнілі сховішчы Нацыянальнай бібліятэкі ў 1995 годзе, 27.445 экземпляраў уяўляюць замежныя выданні.

У дзевяностых гадах у Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь пачалося стварэнне аўтаматызаванай інфармацыйна-бібліятэчнай сістэмы, а з 1993 года ідзе стварэнне электроннага каталога. Ужо сёння тут дзейнічаюць 70 аўтаматызаваных працоўных месцаў, 53 з якіх уключаны ў лакальную сетку. Фінансавую падтрымку праекта па аўтаматызацыі аказалі, у прыватнасці, Беларускае аддзяленне фонду Сораса і ЮНЕСКО.

І ўсё ж трэба адзначыць, што на сённяшні дзень Нацыянальная бібліятэка Беларусі [illegible] і даўно ўжо не ўмяшчаецца ў памяшканні, адведзеным ёй.

Штодзённа да яе паслуг звяртаецца каля 3 тысяч чытачоў, а штогадовая кнігавыдача складае 2,7 млн. экземпляраў кніг.

Магчыма, не ўсім вядома, што па першапачатковаму праекту архітэктара Г. Лаўрова мяркавалася размяшчэнне [illegible] корпуса кнігасховішча. З пачатку яго будаўніцтва было адкладзена, а потым ад яго адмовіліся ўвогуле. І толькі ў канцы 50-х гадоў бібліятэка была пашырана прыбудовай новага корпуса, які па свайму архітэктурнаму рашэнню ніяк не стасуецца з даваенным будынкам. У сувязі з тым, што будаўніцтва корпуса кнігасховішча так і не ажыццявілася, яго функцыі былі перададзены ў галоўны корпус, і плошчы чытальных залаў былі скарочаны.

Выходзіць, што памяшканне было цесным яшчэ паўстагоддзя назад. І цяпер практычна нічога не змянілася. Нацыянальнай бібліятэцы, акрамя галоўнага корпуса па вул. Чырвонаармейскай, належыць будынак былога райкома партыі, які прымыкае да яго, будынкі па вуліцы Кірава і Партызанскім праспекце.

Вось якая раскіданасць! А фонды Нацыянальнай бібліятэкі, між тым, па сваёй сутнасці універсальныя. Тут ёсць выданні вядомай венецыянскай тыпаграфіі Альдаў (XV—XVI стст.), Францыска Скарыны, Івана Фёдарава, Пятра Мсціслаўца, [illegible] графіку, рукапісы і рукапісныя мікрафільмы, грампласцінкі, касеты, дыскеты, кампакт-дыскі, CD-ромы.

Адзіным выйсцем для Нацыянальнай бібліятэкі з'яўляецца будаўніцтва новага будынка. Рашэнне аб гэтым было прынята беларускім урадам. Таксама было вызначана месца ў мікрараёне «Усход». Праводзіўся конкурс, і сярод двух маскоўскіх і чатырох беларускіх праектных інстытутаў перамогу атрымаў «Мінскпраект». Пра будынак, які яны прапанавалі, работнікам Нацыянальнай бібліятэкі застаецца толькі марыць: на ўзроўні рабочага праекта ўсе далейшыя дзеянні, па прычыне адсутнасці грашовых сродкаў былі спынены. А між тым прапанаваны праект улічвае ўсе сучасныя патрабаванні: рацыянальнае размяшчэнне чытальных залаў, кнігасховішча, тэхнічных службаў.

Ці варта марыць пра нешта новае, калі нават рэканструкцыя памяшкання для аддзела рэдкай старапіснай кнігі, якая вядзецца ў Старым горадзе, цягнецца з 1983 года...

Міжволі прыходзіш да высновы, што час ідзе, а нічога не мяняецца — культура па-ранейшаму фінансуецца па рэшткаваму прынцыпу. Як можна разважаць аб адраджэнні нацыянальнай культуры, калі галоўная бібліятэка нашай краіны — яе скарбніца — у такім заняпадзе?

Надзея НІКАЛАЕВА.

На здымках: [illegible] новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі і будынак бібліятэкі імя У. І. Леніна ўзору 1931 года.

АДУСЮЛЬ

Новы год у Кітаі

У панядзелак кітайцы святкавалі самае вялікае і самае значнае народнае свята — свята вясны. Гэтак называецца першы дзень Новага года па месячным календары, калі на неабсяжных прасторах Кітая ўжо прыходзіць ранняя вясна. Абуджэнне прыроды дае чалавеку новы настрой і стваральную энергію, выклікае радасць і вясёласць. Можа, таму такая атмасфера характэрна для свята, якое адзначаецца пачынаючы з 2 ст. да н. э.

Новы год у Кітаі святкуюць цэлы тыдзень, прычым першыя тры дні згодна з законам ніхто не працуе. Першы дзень Новага года прынята сустракаць дома, сярод самых блізкіх і родных людзей. На другі дзень кітайцы ходзяць у госці. На трэці дзень Новага года прынята праводзіць святы ліхтароў, выстаўкі і [illegible] народныя гулянні.

Што купляюць кітайцы напярэдадні свята? Найперш, вядома ж, ежу. Па традыцыі на навагоднім стале павінна быць багата закусак і гарачых страў, уключаючы мясныя і абавязкова рыбныя. Таксама абавязкова на стале павінна быць кітайская гарэлка. [illegible]

Самым блізкім — сваякам, [illegible] даюць грошы ў чырвоным канверціку альбо загорнутымі ў чырвоную паперу (чырвоны колер у Кітаі — колер шчасця і дабрабыту). [illegible]

Традыцыйным для кітайскай навагодняй сімвалікі з'яўляюцца таксама карціны-лубкі. [illegible] Кітаец ніколі не скажа пра такую карціну: я яе купіў, ён скажа: я запрасіў яе ў дом, у сям'ю. [illegible]

Таксама паўсюль — на вуліцах, у парках, перад адміністрацыйнымі будынкамі і рэстаранамі — вывешваюцца чырвоныя ліхтары [illegible].

Адным словам, кітайцы любяць свята Новага года і імкнуцца годна і ўрачыста яго сустрэць.

Пятро РАГОЙША,
(паводле Міжнароднага кітайскага радыё)

Тэлебачанне, 22 лютага

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 «З душой», «Прышэлец». Дак. фільмы.
9.00 «Вестгейт». Тэлесерыял.
9.55 «Добры лес». Мультфільм.
10.10 І. Шамякін. «Экзамен на восень». Тэлеспектакль.
12.00 «Танга. Танга». Фільм-канцэрт.
12.30—13.40 «Сакрэтны фарватэр». Маст. фільм. 4-я серыя.
15.00 Навіны.
15.15 «Магія чорная і белая». Дак. фільм.
15.40 Мультклуб.
16.50 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 7-ы клас. Паўлюк Багрым — паэт і мастак.
17.20 Экамір-96.
17.50 Музычны антракт.
18.00 Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.00 Канцэрт, прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.
20.25 «Поры года». Кінанарыс.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 «Застава Ільіча». Маст. фільм. 2-я серыя.
23.45 «Крок». Праграма для моладзі.
0.15 Навіны.

ГРТ

5.00 Тэлераніца.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.55 Навіны.
8.15 «Сакрэт трапіканкі».
9.10 «Парыжскія тайны. Жан Марэ — акцёр і чалавек». Частка 2-я. Аўтарская праграма Э.Разанава.
9.50 «Клуб падарожнікаў».
10.40 Смак.
11.10 У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». «Пад дахам свету».
11.50 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Серыял. 3-я серыя.
14.20 «Драконы падзямелляў».
14.40 Лега-го!
15.10 Цін-Тонік.
15.35 «Элен і хлопцы».
16.00 Рок-урок.
16.30 «Сем дзён спорту».
17.20 «Сакрэт трапіканкі».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 Лато-мільён.
19.00 «Адзін на адзін».
19.45 «Добрай ночы, малышы!»
20.00 Час.
20.30 «Аперацыя».
20.50 «Шчыт і меч». Фільм 3-і. «Абскарджанню не падлягае».
22.10 Музабоз-94.
23.05 «Новыя абывацелі».
23.30 «Т.С.Н.».
0.20 «Сем дзён спорту».

Канал «Расія»

6.30 Час дзелавых людзей.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
7.25 Патрабуюцца...
7.30 «Што дзень наступны...»
7.35 Рытміка.
7.50 Усяго патроху.
8.40 Тэлегазета.
8.45 Сялянскае пытанне.
9.05 «Санта-Барбара».
10.20 Міліцэйская хроніка.
10.30 «Кучугуры і наваколле». Перадача 4-я.
10.50 «Чароўны школьны аўтобус». Мультсерыял.
11.20—11.30 Новая лінія.
15.05 Там-там навіны.
15.20 Свята кожны дзень.
15.30 Новая лінія.
16.20 «Успамінаючы Драгунскага».
17.25 Ваш партнёр.
17.40 Ваша права.
17.55 Кіно з працягам. «Пецярбургскія тайны».
19.25 Падрабязнасці.
19.35 «Санта-Барбара».
20.30 Нос. Гумарыстычная праграма.
21.10 На палітычным Алімпе.
22.30 Рака часу.
22.35 [illegible]

22.40 Ціхі дом. Праграма С. Шолахава.
23.30—23.40 Экран крымінальных паведамленняў.

РТР

7.30 Мір вашаму дому.
7.40, 10.30, 13.30, 16.45 Навіны.
7.50 Нямецкая мова для дзяцей.
8.10 «Шыварат-навыварат». Мультфільм.
8.20 Жывая класіка. «Я, Бамаршэ». Перадача 2-я.
9.30 Падарожжа ў краіну іспанскай мовы. 1-ы і 2-і гады навучання.
10.35 Асацыяцыя «Наша кіно» прадстаўляе.
12.30 Гадзіна «Рэаліста».
13.35 Крыніцы.
14.05 Відэапаэзія. Канстанцін Сіманаў.
14.10 Сакральныя цывілізацыі.
14.40 «Жарт». Кароткаметражны маст.фільм.
15.10 Новая пачатковая школа.
15.40 Ніжнегародскаму опернаму 60.
16.25 «Маскоўскія Пенаты». П.Я.Чаадаеў.

НТБ

17.00 Кінатэатр юнага гледача. «Цудоўныя гады». 84-я серыя (ЗША).
17.30 Паўгадзіны пра тэніс.
18.00, 21.00, 23.00 «Сёння». Інфармацыйная праграма.
18.35 Герой дня.
19.00 Прэмія «Оскар». Дасцін Хофман і Йон Войт у фільме Джона Шлезінгера «Паўночны каўбой» (ЗША).
21.35 Гадзіна серыяла. «Доктар Куін, жанчына-ўрач». 36-я серыя (ЗША).
22.30 Часінка.
23.20 Кіно не для ўсіх. Маст.фільм «Замак» (Грузія).

Санкт-Пецярбург

12.00, 15.30, 18.30, 21.45 Інфарм ТБ.
12.10 «Гром у раі». Серыял.
12.55, 18.55, 21.40, 22.20 Музычны момант.
13.00 Хуткая дапамога.
13.30 Парады садаводам.
13.40 Дом кіно. А. Фрэйндліх, Я. Лебедзеў, А. Басілашвілі, С. Кручкова і іншыя.
14.55 «Правакацыі... фантазіі... Дж. Радары». Перадача для дзяцей.
15.15 Стыль жыцця.
15.40 «Нямецкая хваля».
16.00 «Мітэндрын у супермаркеце». Фільм цыкла «Экалогія для ўсіх» (Германія).
16.25 Дзевяты фестываль Пецярбургскага рок-клуба. Перадача 2-я.
17.00 Па ўсёй Расіі.
17.10 Паказвае Ленінградская АТК.
18.10 Вялікі фестываль.
18.50 Спартыўныя навіны.
19.00 «Гром у раі». Серыял.
19.50 Тэлеслужба бяспекі.
20.00 «Пастарайцеся вярнуцца назад». Відэафільм.
20.25 «Тры гадзіны да вайны».
20.50 «Залаты Цялец». Забаўляльная праграма.
22.00 Спорт, спорт.
22.10—22.25 Дзень нараджэння.

Страчаны дыплом ІВ № 231371 з адзнакай аб заканчэнні Мінскага інстытута культуры на імя Смольскага Генадзя Анатольевіча **лічыць несапраўдным.**

Згубленае пасведчанне ліквідатара наступстваў аварыі на ЧАЭС № 307409, выдадзенае на імя Бандаровіча Леаніда Аляксеевіча, **лічыць несапраўдным.**

ЛАЎКА АЎТААМАТАРА

ЯК І ЯКІ ВЫБРАЦЬ АЎТАМАБІЛЬ

(Частка першая)

Мы будзем весці гаворку пра патрыманыя аўтамабілі, бо новы — ён і ёсць новы. Тут, як кажуць, пашанцуе ці не.

Што датычыць патрыманай машыны, то ў яе ёсць свае перавагі: меншая цана, але практычна тыя ж эксплуатацыйныя магчымасці, што і ў новай, але самае галоўнае, што яе лягчэй набыць, хаця і цяжэй выбраць.

Пры ацэнцы аўтамабіля ў першую чаргу трэба звярнуць ўвагу, у якім стане знаходзіцца кузаў, і толькі потым прыступаць да праслухоўвання рухавіка і пробнай паездкі. Пры аглядзе кузава лепш за ўсё ўявіць для сябе поўную карціну, як і дзе, з якой інтэнсіўнасцю эксплуатавалася машына, у якіх калатнечах яна пабывала. Трэба ўлічваць, што кузаў — аснова асноў легкавога аўтамабіля: ён нясе на сабе ўсе агрэгаты, таму яго і назвалі апорным. Акрамя таго, кузаў сёння — адзін з самых каштоўных вузлоў сучаснага аўтамабіля.

Перш-наперш трэба адысці на некалькі крокаў і агледзець паверхні бакоў кузава і вызначыць, ці не мае ён дэфармацыі. З першага погляду цяжка ўбачыць дробныя дэфекты, але калі прыгледзецца ўважліва, то гэтыя дробязі добра фіксуюцца. Блікі святла звычайна ідуць амаль прамалінейна, а ў месцах, дзе ёсць дэфект, блік ці перарываецца, ці ідзе па дузе, значыць, у гэтым месцы была дэфармацыя металу і яе проста зафарбавалі. На даху аўтамабіля блікі заўсёды разыходзяцца, нагадваючы сваімі праменямі разгорнуты веер. Калі ж у гэтага веера промні маюць скрыўленні, значыць, з дахам нешта рабілі і магчыма, што машына кулялася ў кювет. Вынікі вялікай аварыі ці моцнага ўдару менш бачны, бо звычайна рамонт праводзяць з заменай крылаў і дзвярэй. У гэтым выпадку дах і падкажа, у якія перыпетыі трапляў аўтамабіль. Закончыўшы такі папярэдні агляд, прыступаюць да больш прыдзірлівага агляду афарбоўкі: ці не мае яна розных адценняў на крылах, капоце, дзвярах і даху аўтамабіля. Калі фарба здаецца свежай, то гэта частка была ў аварыі. Звычайна нават і не вельмі добры маляр можа падабраць колер, але бляск усё роўна выдасць месца падфарбоўкі — ён будзе крыху іншы. Адсутнасць бляску фарбы па ўсім кузаве аўтамабіля гаворыць аб доўгай эксплуатацыі і сведчыць аб дрэнным даглядзе і захоўванні. Калі аўтамабіль захоўваўся на адкрытай стаянцы, то на даху і капоце бачны невялікія трэшчыны, якія з'яўляюцца з-за несвоечасовай уборкі лісця і галінак з дрэў. Ведаючы аб гэтым, уладальнік пачынае паліраваць кузаў аўтамабіля ці наносіць слой фарбы. Валокны ад паліровачнага матэрыялу ці пасты пры гэтым усё роўна застаюцца на невялікіх участках. Каб праверыць, ці рабілася падфарбоўка, трэба адхінуць гуму на ветравым ці заднім шкле.

Часта для таго, каб выраўнаваць паверхню кузава аўтамабіля, прымяняюць шпаклёўку на аснове слігамераў халоднага зацвердзявання.

Знайсці месца, дзе рабіліся такія аперацыі, дапаможа пастаянны магніт. Калі магніт абматаць фланеллю, то з яго дапамогай лёгка знайсці месца шпаклявання і нават яго прыкладную таўшчыню па намаганню, якое прыйдзецца прыкласці, каб магніт правесці па паверхні. Калі з'явілася жаданне праверыць кузаў — ці мае ён пракаразіраваныя месцы, то гэта таксама можна зрабіць з дапамогай магніта, а не наносіць хаатычныя ўколы шылам, як гэта часам робяць некаторыя аўтааматары. Трэба памятаць, што слой шпаклёўкі з нейкай смалы з арміраваннем мае тое ж супраціўленне ўколу шыла, як і метал, а вось магніт зараз жа знойдзе скрыты дэфект.

На аўтамабілі заўсёды ёсць дэталі з хрому. Гэтыя дэталі нават пры самым пільным даглядзе з часам пакрываюцца дробнымі плямамі карозіі, якія нельга ліквідаваць нават паліравальнай пастай. У залежнасці ад стану афарбоўкі храміраваных дэталей кузава, шкла і робіцца выснова, як захоўваўся і эксплуатаваўся аўтамабіль.

Абысціся можна без памочнікаў

Пры рабоце з тармазной сістэмай ці счапленнем на аўтамабілі нярэдка патрабуецца трымаць адпаведныя педалі ў націснутым стане. Звычайна гэта робіць памочнік. Але яго замяніць прыстасаванне — упор, які рассоўваецца. Ён паказаны на малюнку.

Пры прапампоўцы сістэм, калі з іх выходзіць вадкасць, прыстасаванне вельмі добра апускае педаль да канца.

Фіксацыя педалі:
1 — педаль тормаза ці счаплення;
2 — прыстасаванне;
3 — пласціна;
4 — сядзенне.

Азбука вадзіцеля

● *Усе дзеянні і манеўры трэба выконваць так, каб яны былі зразумелыя іншым. Трэба ў першую чаргу прадугледзець магчымасць грубых памылак і парушэнняў правілаў дарожнага руху іншымі вадзіцелямі.*

● ***Ніколі не трэба нервавацца і спяшацца, калі зрабіў памылку (напрыклад, заглух матор пры крананні з месца), — гэта захавае вас ад больш сур'ёзных памылак.***

● *У крытычнай сітуацыі ні ў якім разе нельга выязджаць на паласу сустрэчнага руху. Сутыкненне са спадарожнымі машынамі ў сотні разоў больш бяспечнае.*

● ***На скрыжаванні галоўнай дарогі трэба захоўваць асцярожнасць, нават калі ёсць перавага.***

● *Не трэба ствараць перашкод іншым, лепей займаць правыя палосы на праезнай частцы. Калі паласа адна і дастаткова шырокая, лепш трымацца бліжэй да правага яе краю. Крайняя правая паласа не вельмі зручная для руху, таму што могуць стварыць нечаканыя перашкоды машыны, што прыпыняюцца ці толькі пачынаюць рухацца.*

САМАРОБНАЯ ПРАКЛАДКА

Праблема падцёкаў масла з-пад накрыўкі галоўкі цыліндраў на рухавіках «Жыгулёў» узнікае даволі часта. Каб яно больш не падцякала, трэба падлажыць у канаўку на накрыўцы новую кардонную пракладку шырынёй 3-4 мм і таўшчынёй 1 мм, а затым ужо гумавую. Зацягваць гайкі трэба так, каб толькі злёгку дэфармавалася гумавая пракладка.

ДВА — ЛЕПЕЙ ЧЫМ АДНО

Для прадухілення прарыву газаў паміж поршнямі і сценкай цыліндра і павелічэння кампрэсіі матацыклісты прымяняюць самыя розныя спосабы. Адзін з іх, калі расточваецца канаўка пад верхняе кампрэсійнае кольца да такой шырыні, каб у яе ўстаўляліся два такія кольцы. Затым у поршні свідруецца яшчэ адна дзірка пад фіксуючы штыфт. Размяшчаць яго трэба так, каб ён знаходзіўся паміж упускным і выпускным вокнамі цыліндра. Далей на поршань надзяваюць кольцы, і ён манціруецца ў рухавік.

Трэба адзначыць, што кампрэсія з такім поршнем значна лепшая, а эксплуатацыя рухавіка ніякіх заўваг не выклікае.

1 — дадатковы штыфт, 2 — дадатковае поршневае кольца, 3 — штатнае поршневае кольца, 4 — штатны штыфт.

Дапамагае звычайная вада

Калі на бляшанках з маслам адсутнічае этыкетка, а гэта вельмі часта бывае ў гаражных прыпасах, вызначыць, якое з іх маторнае, а якое трансмісійнае, па колеру і паху вельмі цяжка. Паспрабуйце зрабіць так: капніце масла ў ваду. Калі кропля ў выглядзе лінзы плавае не змяняючыся некалькі хвілін, — масла маторнае, а калі ў лічаныя хвіліны расплылося на паверхні вады, утварыўшы вясёлкавую плёнку, — масла трансмісійнае.

Зрабіце месца для начлегу

У «Ніве» задняе сядзенне не раскладваецца. Паспрабуйце перарабіць петлі, каб яны злучалі спінку з падушкамі. Для гэтага выбіце пальцы з петляў, адрэжце частку пятлі на спінцы і замацуйце яе, павярнуўшы на 180°. Цяпер сядзенне будзе раскладвацца, і ў машыне з'явіцца зручнае месца для начлегу.

Рубрыку вядзе Сяргей ТАРАСЕВІЧ.

На здымку: у час уручэння стыпендый у філармоніі.

Дапамагчы раскрыцца талентам

У 1995 годзе ў Беларусі была створана грамадская арганізацыя «Фонд падтрымкі беларускай культуры». З ініцыятывай яе стварэння выступілі вядомыя ў рэспубліцы бізнесмены, літаратары, кінематаграфісты, мастакі, навукоўцы, тэатральныя дзеячы.

У Звароце Фонду да дзяржаўных, недзяржаўных і камерцыйных структур адзначалася: «Гаварыць пра тое, што мову, культуру народа трэба ратаваць, і ратаваць неадкладна, — мала. Трэба дзейнічаць. Трэба кожнаму рабіць і зрабіць тое, што ён можа, на што ён здольны».

Адной з апошніх акцый фонду стала прысуджэнне стыпендый двум вучням рэспубліканскага ліцэя пры Беларускай акадэміі музыкі — Дзянісу Маслюку (педагог А. Гужалоўская) і Любе Янпольскай. Стыпендыі ва ўрачыстай абстаноўцы былі ўручаны перад вялікім канцэртам вучняў ліцэя ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Крыху пазней удалося пазнаёміцца з адным са стыпендыятаў — Любай Янпольскай. З 6 гадоў гэта дзяўчынка займаецца музыкай. Дарэчы, яна піяністка ў трэцім пакаленні.

У ліцэі дзяўчынка вучыцца з 3 класа. Пра яе здольнасці можа сведчыць ужо той факт, што ў 4 класе яна прымала ўдзел у конкурсе Дварыёнаса ў Вільнюсе. Пазней яна неаднойчы выступала з камерным аркестрам філармоніі, з Вялікім сімфанічным. У касцёле Святога Роха ў Мінску Люба Янпольская выканала свой сольны канцэрт, у праграме якога была саната Моцарта з фантазіяй до-мінор і саната Бетховена. Згадзіцеся, што не кожнаму юнаму музыканту выпадае такі гонар: выступаць на філарманічнай сцэне. Па праву могуць ганарыцца гэтым педагог Любы ў ліцэі прафесар Валянціна Рах[illegible] [illegible] ка Ларыса Янпольская.

Стыпендыя, якую прысудзіў фонд Любе Янпольскай, — 250 тысяч рублёў у месяц на працягу паўгода, — зусім невялікая сума, і яна ў прынцыпе не зможа вырашыць тых матэрыяльных праблем, што існуюць у іх невялікай сям'і, бо жыць даводзіцца на адну зарплату маці.

Аднак маці Любы, Ларыса Янпольская, лічыць гэту стыпендыю фактарам маральнай падтрымкі з боку грамадства.

— Пакуль у дачкі ўсё атрымліваецца, і яна не думае ні аб чым, акрамя музыкі, — кажа Ларыса Янпольская, — але тым не менш я з трывогай думаю пра будучыню Любы. Праблемай для яе будзе нават тое, як паехаць на прэстыжны міжнародны конкурс, а з цягам часу яна сутыкнецца з тым, што прафесія музыканта, якая вымагае такога намагання фізічных і псіхічных сіл, не забяспечвае ёй прыстойнага існавання.

У гэтай сітуацыі відавочна наступнае: калі народжаныя і ўзгадаваныя на нашай зямлі таленты так і не навучыцца цаніць свая дзяржава, яны не змогуць раскрыцца ў поўнай меры, альбо стануць гонарам іншых краін.

Тацціна АНТОНАВА.

Рыбацкія гісторыі

А ЛЫЖЫ НАВОШТА?

Такая зіма! Не мог не звязацца з героем аднаго са сваіх артыкулаў, прызнаным аматарам-рыбаловам, чэмпіёнам Віцебскай вобласці Уладзіславам Фаміным.

— Слава, маразы, снег — а як рыбалка?

— Выдатная рыбалка. Ты ж ведаеш, што маё любімае возера — Нарач. І сёлета з сябрамі ездзім толькі туды. Снегу шмат? А мы ў аўтобус бяром з сабою лыжы. І на лыжах, бывае, адмахаеш столькі, колькі спартсмен сабе на дзень намячае. «Запрацаваная», як кажуць, рыба. Трэба ведаць, дзе яе шукаць, трэба прайсці па снезе (а часам пад ім і вада) нямала кіламетраў. Затое з палонкі выцягваеш да дзесяці рыбін. Наша здабыча ў асноўным акуні. Але ж затое якія! Ад 200 да 800 грамаў сустракаюцца «гарбылі». Мой асабісты рэкорд на гэтай зімовай рыбалцы — сіг на 2 кілаграмы.

Так што сёлета наша Нарач радуе рыбакоў-аматараў добрым уловам. Толькі старайцеся.

ДЗЯКУЙ ПЕРАБУДОВЕ

У любым застоллі, калі яно больш-менш вялікае, адразу ўтвараюцца купкі «па інтарэсах». Заўсёды люблю прысуседзіцца да рыбацкай — душа, напэўна, такая. Стараваты дзядзька расправядае:

— Дзякуй перабудове, вялікі дзякуй, без яе, напэўна, не выжылі б.

— Якая перабудова, гэта ты пра Гарбачова? — з патэнцыялам палітычнай злосці пытаецца маладзейшы суразмоўца.

— Які Гарбачоў? Ты вось ведаеш, што такое стронга?

— Стронга?

— Во! Я яе малым лавіў у нашай рэчцы ледзь не рукамі. А потым знікла гэта рыба. Чыстую ваду яна любіць. Чы-с-ту-ю!

— Ну і што?

— А тое, што гэтым летам я стронгу такі злавіў. З'явілася, мілая. Таму, дзякуй перабудове і ўсяму таму, што за гэтым прыйшло: менш стала ўгнаенняў, менш розных там гербіцыдаў — дзякуй Богу, што на іх грошай няма. Чысцее наша вада, чысцеюць рэкі. Стронга вяртаецца!

ЛІНІ НЕЗЛІЧОНЫЯ

Жонка прыйшла дадому ў добрым настроі:

— Свежай рыбы пад крамаю купіла.

Так, свежую рыбу ў нашай сям'і любяць усе. Але займацца ёю даводзіцца гаспадару. Калі ж [illegible]

Паўтара кілаграма рыбы. І гэта 22, я пералічыў спецыяльна, маленькія ліні. Лінь — рыба ў нас на Беларусі, калі верыць даведнікам, даволі распаўсюджаная, але ў рыбакоў-аматараў лічыцца вельмі ўдалым уловам. Што тут гаварыць, смачная, даволі рэдкая сёння рыба, якая жыве пераважна ў азёрах.

Ах, вось што яно! Сёлета азёры заціснуты вялікім лёдам, накрыты тоўстым слоем снегу. Задыхаецца рыба.

Неяк, яшчэ хлапчуком, давялося назіраць, як задыхаецца рыба. Стаялі таксама моцныя маразы, шмат было снегу. І ў азёрах рыбе, найперш той, што месціцца на зіму ў глеі, ля самага дна, перастала хапаць кіслароду. Дарослыя высякалі ў тоўстым лёдзе на возеры палонкі. І ў гэтых палонках адразу ж з'ўлялася процьма рыбы. Яна была нейкая санлівая, не падобная сама на сябе. Чэрпай чым хочаш, можаш нават кашом.

Атрымліваецца, сёлета рыбу напаткаў чарговы мор. А мы гэтым скарысталіся.

ХТО КАГО

Не апошнюю на Беларусі рэчку Дзісну, якая ўпадае ў Балтыйскае мора, канечне, папярэдне далучыўшыся да Заходняй Дзвіны, мясцовыя жыхары і ўсе рыбакі называюць Дзісенкай. Ну павялося так, і нічога ты ўжо са сваёй геаграфіяй не зробіш. І жыве на гэтай Дзісенцы, на сумежжы трох раёнаў Віцебшчыны дзівак-рыбак. Сапраўды Дзівак. Вось ужо амаль дваццаць гадоў змагаецца ён з адной рыбінай.

Пачалося ў юнацтве, калі бегаў па беразе рэчкі з вудай, падсякаў акунёў, язёў, часам невялікага шчупака. Тут і запрымеціў у адной з заток — глыбокай, зацішнай вялікую рыбіну. Распытаў у старэйшых.

СОМ

З той пары і страціў спакой. Дваццаць гадоў цягнецца гэта адзінаборства. Усякія прынады прыдумваў чалавек, усякія прылады. Пра жаб даўно забыўся: варон спецыяльна для таго самага смажыў, ды чаго толькі ні паспрабаваў — не даецца.

Два разы здавалася, што вось ён — твой. Але адзін раз лёска падвяла, другі раз сам рыбак схібіў. Ну не даецца рыбіна, і ўсё тут. Але верыцца, верыцца, што ў рэшце рэшт сом, які ўпарта не сходзіць са свайго месца, усё-такі будзе злоўлены.

Старэе сом. Старэе чалавек.

Алесь КАСЦЕНЬ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».
Рэгістрацыйны нумар 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Р. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220013, гор. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 68-29-19; [illegible]

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.
Тыраж 113.324. Індэкс 63.850. Зак. № 917.
Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 20.15.